Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

23 ЧЭРВЕНЯ 2017 г. ПЯТНІЦА №118 (28482)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



### Сядзібны дом на Ушаччыне шукае гаспадара

СТАР. 2



### На звяздоўскім паверсе

СТАР. 15



### Праграма тэлебачання на тыдзень

20 КАНАЛАЎ

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Міхаіл МЯСНІКОВІЧ, старшыня Савета Рэспублікі:**

*«Любыя спрэчныя пытанні, якія ўзнікаюць па пастаўках беларускага харчавання на расійскі рынак, павінны вырашацца па схеме, узгодненай у Еўразійскай эканамічнай камісіі. Калі на прадпрыемстве выяўляецца факт парушэння, экспарт спыняецца, і бок, які прадстаўляе гэтае прадпрыемства, разбіраецца ў сітуацыі, ліквідуе парушэнне, калі яно сапраўды ёсць, а таксама дае расійскаму боку ўсю неабходную дакументацыю. Аднак на практыцы ўзаемадзеянне бакоў ідзе не па гэтай схеме... Любую спрэчку можна вырашыць, галоўнае пры гэтым — узаемная павага бакоў... Пры гэтым важна не дапускаць, каб назапашаныя эканамічныя прэтэнзіі канвертаваліся ў палітычныя супярэчнасці, якія потым трэба разглядаць на самым высокім узроўні».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 23.06.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9309 | ▲ |
| Еўра | 2,1556 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0320 | ■ |
| Укр. грыўня | 0,0742 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

■ Спецыяльны рэпартаж

# За кулісамі свята

Карэспандэнты «Звязды» пабывалі на рэпетыцыі ваеннага парада, які адбудзецца на Дзень Незалежнасці ў Мінску





Фота Надзеі БУЖАН.

СТАР. 3

■ Здаровае харчаванне

## ЯШЧЭ МЕНШ СОЛІ, ЦУКРУ І ТЛУШЧУ

А паведамляць спажыўцу пра гэтыя складнікі прадукту будзе, магчыма, святлафор, размешчаны на ўпакоўцы

**Да 2030 года плануецца асвоіць і вывесці на рынак новыя прадукты функцыянальнага прызначэння без хімічных дабавак, з мінімальнай колькасцю солі, цукру, збалансаваных па тлушчакіслотным і трыгліцэрыдным складзе, без генна-мадыфікаваных арганізмаў. Змяніць плануецца і харчаванне ў арганізаваных калектывах дзіцячых і школьных адукацыйных устаноў.**

Асноўныя пытанні ў гэтым кірунку абмяркоўваліся падчас першага міжнароднага кангрэса «Навука, харчаванне і здароўе» з удзелам прадстаўнікоў 75 арганізацый Беларусі, Расіі, Украіны, Казахстана, Латвіі, Літвы, Польшчы. Паводле слоў **намесніка генеральнага дырэктара па якасці і стандартызацыі Навукова-практычнага цэнтра па харчаванні НАН Беларусі Алены МАРГУНОВАЙ,** у цэнтры ўвагі аказалася, напрыклад, узбагачэнне харчовых прадуктаў мінеральнымі злучэннямі і вітамінамі — карэкцыя ёдавага і цынкавага дэфіцыту, а таксама змяншэнне насычанага тлушчу, якасць пітной вады, дзіцячае харчаванне.



СТАР. 4

■ Прыёмная кампанія — 2017

## ЦІ БУДУЦЬ НА ЦТ СТАБАЛЬНІКІ?

Адказ на гэта пытанне мы даведаемся праз некалькі дзён

**Вынікі ўдзельнікаў цэнтралізаванага тэсціравання па беларускай і рускай мовах стануць вядомыя да канца бягучага тыдня. Пра гэта журналісту «Звязды» паведаміў дырэктар Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў Мікалай ФЯСЬКОЎ. Звычайна іх абвяшчаюць адначасова, нягледзячы на тое, што беларускую мову абітурыенты здавалі на два дні раней, да таго ж і колькасць удзельнікаў ЦТ па роднай мове, на жаль, значна меншая.**



Нецярплівасці абітурыентаў, якія не разумеюць, чаму вынікаў тэсціравання даводзіцца чакаць да дзесяці дзён, у Рэспубліканскім інстытуце кантролю ведаў не падзяляюць. І тлумачаць: працэс праверкі работ стрымлівае верыфікацыя, якая ажыццяўляецца выключна ў інтарэсах абітурыентаў. Праблема ў тым, што сучаснае праграмнае забеспячэнне не гарантуе стапрацэнтную якасць пераводу рукапіснага тэксту ў электронны фармат (асабліва калі чорнае чарніла ў гелевай ручцы мае серабрыстае адценне). Таму задача верыфікатараў — прасачыць за правільнасцю распазнавання сімвалаў на бланках. Скажам, камп'ютар можа прыняць лічбу «3» за лічбу «8» ці лічбу «1» за лічбу «7», калі яна напісана неакуратна. Чалавек гэта бачыць і папярэджвае магчымую памылку.

СТАР. 3

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА,
5 разоў на тыдзень!
Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе 2017 года!
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

# НА «ЕЎРАЗІЙСКІМ ПЕРАКРЫЖАВАННІ»

## Для нашай краіны важна супрацоўніцтва і з Усходам, і з Захадам

**Беларускае старшынства ў Цэнтральна-Еўрапейскай ініцыятыве называюць паспяховым. Прычым не толькі нашы дыпламаты, але і прадстаўнікі іншых краін-удзельніц рэгіянальнага аб'яднання. Гэтых дзяржаў васямнаццаць. Учора ў Палацы Незалежнасці адбылася сустрэча Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі і міністраў замежных спраў краін ЦЕІ, дзе замежныя дыпламаты канстатавалі: беларускае старшынства ў арганізацыі праходзіць актыўна і ініцыятыўна.**

### БЕЗ РАЗДЗЯЛЯЛЬНЫХ ЛІНІЙ

Галоўная задача, якую перад сабой ставіць аб'яднанне, у многім сугучная знешнепалітычным мэтам нашай краіны. Так, мэта ЦЕІ — умацаванне гнуткага і прагматычнага еўрапейскага рэгіянальнага супрацоўніцтва для папярэджання стварэння новых раздзяляльных ліній у Еўропе. Арганізацыя — важны форум для развіцця супрацоўніцтва дзяржаў не толькі Цэнтральнай, але і Усходняй, Паўднёва-Усходняй Еўропы. Прынамсі, у сферах трансгранічнага супрацоўніцтва, энергетыкі, транспарту, навукі і тэхналогій, адукацыі, культуры, малога і сярэдняга бізнесу, сельскай гаспадаркі, аховы навакольнага асяроддзя, абароны нацыянальных меншасцяў, турызму і маладзёжнай палітыкі.

Аляксандр Лукашэнка, вітаючы замежных дыпламатаў, звярнуў увагу: беларуская сталіца ўсё часцей становіцца пляцоўкай для знакавых міжнародных мерапрыемстваў, якія садзейнічаюць умацаванню стабільнасці ў рэгіёне. Ён таксама выказаў спадзяванне, што іх знаходжанне ў Беларусі дазволіць аб'ектыўна ацаніць новыя перспектывы супрацоўніцтва з нашай дзяржавай:

— Знешняя палітыка нашай краіны заснавана на шматвектарнасці і міралюбстве. Мы імкнёмся выбудоўваць сяброўскія ўзаемавыгадныя адносіны з усімі дзяржавамі. Для нашай краіны ў роўнай ступені важна развіваць супрацоўніцтва з Усходам і з Захадам, не робячы штучнага выбару паміж імі. Аднак ёсць пэўныя сілы, якія не пакідаюць спроб адрадзіць блокавую палітыку мінулага. Хто як не мы, прадстаўнікі дзяржаў Цэнтральнай і Усходняй Еўропы, разумеем, да якіх разбуральных і катастрафічных наступстваў яна можа прывесці.

Напамінала пра гэта і ўчарашняя дата — 22 чэрвеня. Роўна 76 гадоў таму наша краіна аказалася пад страшным ударам фашысцкай Германіі. З гэтага дня Другая сусветная вайна ўступіла ў новы, найбольш кровапралітны этап, у якім загінулі дзясяткі мільёнаў еўрапейцаў. У Беларусі гэта кожны трэці жыхар.

— Мяркую, што гістарычная памяць прымушае нас асабліва цаніць мір і дабрабыт, — заявіў беларускі лідар. — Існуючыя рэаліі такія, што дзяржавам, якія геаграфічна знаходзяцца паміж Еўропай і Азіяй, неабходна браць на сябе больш адказнасці ў пытанні забеспячэння рэгіянальнай стабільнасці. Тым больш, шаноўныя сябры, часам гэта нічога не каштуе — у матэрыяльным плане. Бо ад нас у многім залежыць, ці стануць нашы краіны раздзяляльнай лініяй паміж сусветнымі цэнтрамі сілы або іх сувязным звяном.

### З РАЗЛІКАМ НА ЭКАНОМІКУ

Сапраўды, сёння, калі свет у цэлым, наш рэгіён у прыватнасці, сутыкнуліся з шэрагам самых розных канфліктаў, не самы лепшы час будаваць новыя жалезныя заслоны. Наадварот, як слушна заназначыў кіраўнік беларускай дзяржавы, трэба разам наводзіць масты паміж рознымі інтэграцыйнымі структурамі на кантыненце:

— Толькі праз раўнапраўны дыялог і паўнавартаснае эканамічнае супрацоўніцтва можна стварыць сапраўды Вялікую Еўропу, гарантуючы нашчадкам мір, бяспеку і росквіт. Цэнтральна-Еўрапейская ініцыятыва павінна быць нацэлена на рашэнне менавіта гэтай вельмі складанай, няпростай задачы. З першых дзён свайго існавання яна прызвана развіваць узаемавыгадныя эканамічныя сувязі паміж краінамі Еўропы пасля халоднай вайны.

За больш чым чвэрць стагоддзя работы Цэнтральна-Еўрапейская ініцыятыва даказала сваю запатрабаванасць у якасці пляцоўкі для дыялогу і супрацоўніцтва па шырокім спектры кірункаў. Сёння ж арганізацыя аб'ядноўвае краіны, якія ўваходзяць у самыя розныя інтэграцыйныя аб'яднанні і фарматы.

— Нам неабходна ў поўнай меры выкарыстаць гэты фактар, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Менавіта з гэтай прычыны Беларусь выбрала ў якасці галоўнай тэмы свайго старшынства прасоўванне сумяшчальнасці і ўзаемадапаўняльнасці ў Вялікай Еўропе. Знаходзячыся на «еўразійскім перакрыжаванні», нашы дзяржавы сутыкаюцца з падобнымі складанасцямі ў сацыяльна-эканамічным развіцці. У той жа час гэта стварае велізарныя магчымасці для пашырэння гандлю і актывізацыі сувязяў у іншых сферах.

Мэта, якую ставіць наша дзяржава для свайго старшынства ў ЦЕІ, — надаць дынаміку абмеркаванню праблем, рашэнне якіх неабходна для поўнай рэалізацыі эканамічнага патэнцыялу краін рэгіёна:

— У іх ліку — сінхранізацыя планаў па пашырэнні транспартнай інфраструктуры, збліжэнне стандартаў і працэдур для паскарэння гандлёвых патокаў, развіццё лагістычных паслуг, — пералічыў Прэзідэнт Беларусі. — Хацелася б, каб гэта сустрэча міністраў замежных спраў у Мінску максімальна садзейнічала рашэнню такіх задач.

Так, мы разглядаем сваё старшынства як унікальную магчымасць для эфектыўнага ўцягнення Беларусі ў еўрапейскія інтэграцыйныя працэсы. У той жа час, як падкрэсліў беларускі лідар, немалаважна, што ЦЕІ цесна ўзаемадзейнічае з Еўрапейскім саюзам, удзельнічаючы ў рэалізацыі розных яго праграм і праектаў. Для нас гэта дадатковая магчымасць палепшыць узаемаразуменне з Еўрасаюзам праз прыкладное супрацоўніцтва.

— Таксама мы лічым беларускае старшынства ў ЦЕІ цудоўнай падтрымкай для інтэнсіфікацыі ўзаемадзеяння з іншымі краінамі-членамі, — заявіў Прэзідэнт.

### У АДЗІНОЧКУ СЁННЯ НЕ ВЫЖЫВЕШ

Падчас сустрэчы кіраўнік дзяржавы запрасіў дыпламатаў адкрыта казаць пра тыя пытанні, якія іх турбуюць: і ў дачыненні да ЦЕІ, і ў дачыненні да Беларусі.

Літаральна кожны з міністраў, хто выступаў, звярнуў увагу на сітуацыю, якая сёння склалася ў свеце. Ігар Црнадак, міністр замежных спраў Босніі і Герцагавіны, заўважыў, што цяперашні свет становіцца ўсё больш узаемазвязаным. Барацьба з тэрарызмам, арганізаванай злачыннасцю, праблемы міграцыі — усё гэта стварае неабходнасць развіваць і рэалізоўваць рэгіянальныя праграмы і праекты. Яго калега, міністр замежных і еўрапейскіх спраў Славакіі Міраслаў Лайчак дадаў, што з сучаснымі выклікамі не зможа справіцца самастойна асобная краіна. Ён падкрэсліў: беларускае старшынства ў арганізацыі скіравана на паляпшэнне сітуацыі ў рэгіёне, яно збліжае народы.

З гэтай пазіцыяй пагадзілася і Маргот Клестыль-Лёфлер, намеснік генеральнага сакратара Цэнтральна-Еўрапейскай ініцыятывы. Яна адзначыла, што намаганні Беларусі, якія яна прадпрымае падчас свайго старшынства, надаюць ЦЕІ новае вымярэнне, дазваляюць краінам-удзельніцам наладжваць новыя сувязі.

Абмяркоўваўся падчас сустрэчы і канфлікт ва Украіне. Замежныя дыпламаты падкрэслілі: аналагаў мінскай пляцоўкі па яго ўрэгуляванні няма.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### У выніку выбуху на поўдні Афганістана загінулі 29 чалавек



У выніку падрыву замініраванага аўтамабіля ў горадзе Лашкаргах у правінцыі Гільменд (поўдзень Афганістана) загінулі 29 чалавек, каля 50 атрымалі раненні.

Выбух адбыўся каля аддзялення аднаго з банкаў у 12.00 па мясцовым часе. У гэты момант у офісе фінансавай установы сабралася шмат наведвальнікаў — чыноўнікі і службоўцы атрымлівалі зарплату. Ні адна з дзеючых на тэрыторыі краіны тэрарыстычных груповак пакуль не ўзяла на сябе адказнасць за гэтую атаку.

### Еўрапейцы прадказалі выхад новых краін з ЕС

Услед за Вялікабрытаніяй з ЕС могуць выйсці і іншыя краіны. Так лічыць большасць жыхароў найбуйнейшых краін Еўропы: гэта вынікае з апытання, якое правяла французская сацыялагічная кампанія. Паводле даных даследавання, 52% немцаў, 57% італьянцаў і 64% падданых Вялікабрытаніі выказалі меркаванне, што як мінімум адна краіна ЕС пакіне міждзяржаўнае аб'яднанне. Пры гэтым 55% брытанцаў, 50% італьянцаў, 42% французаў і 39% немцаў выказалі здагадку, што выйсці са складу Еўрасаюза могуць адразу некалькі дзяржаў.

### Насельніцтва планеты павялічваецца і старэе

Колькасць насельніцтва Зямлі складае сёння 7,6 мільярда чалавек і працягвае расці, павялічваючыся ў сярэднім на 83 мільёны за год. Чакаецца, што да 2030 года яна павялічыцца прыкладна на адзін мільярд чалавек і складзе 8,6 мільярда, паведамляе сайт Дэпартамента ААН па эканамічных і сацыяльных пытаннях. У 2050 годзе ў свеце будзе налічвацца 9,8 мільярда чалавек, а ў 2100 годзе — 11,2 мільярда, гаворыцца ў дакладзе, апублікаваным ведамствам. Рост насельніцтва планеты эксперты тлумачаць збольшага павелічэннем сярэдняй працягласці жыцця. Па іх звестках, прыкладна праз 80 гадоў у свеце будзе ў сем разоў больш людзей, старэйшых за 80 гадоў, чым цяпер.

### На французскі пляж мора выкінула амаль дзве тоны какаіну

Супрацоўнікі французскай жандармерыі выявілі каля дзвюх тон наркотыкаў на ўзбярэжжы горада-курорта Мімізан (рэгіён Аквітанія). У рамках расследавання паліцыя ўжо затрымала 11 чалавек, у тым ліку семярых грамадзян Грэцыі. Следчыя ўстанавілі, што грэкі-кантрабандысты перавозілі наркотыкі на дзвюх маторных надзіманых лодках. Аднак паблізу пляжа Мімізана зламысныя сталі цярпець бедства. Дзясяткі цюкоў з наркотыкамі апынуліся ў вадзе, а потым былі выкінутыя акіянскай хваляй на бераг. Усяго было знойдзена 18 цюкоў з какаінам вагой у 100 кілаграм кожны. Аднак у паліцыі не выключаюць, што ўдалося выявіць не ўвесь груз.

## ТЭЛЕФАНУЙЦЕ — ВАМ АДКАЖУЦЬ!

**Ва ўсіх рэгіёнах краіны і ў гэтую суботу пройдуць традыцыйныя прамыя лініі, падчас якіх прадстаўнікі ўлады будуць дапамагаць жыхарам краіны вырашаць набалелыя пытанні, якія датычацца эканамічнага, сацыяльнага і іншых бакоў жыцця.**

**24 чэрвеня з 9.00 да 12.00 на сувязі будуць:**

**ТОКАР Мікалай Васілевіч** — першы намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама (80162213121);

**ЦЯРЭНЦЬЕЎ Уладзімір Уладзіміравіч** — старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў (80212222222);

**МІКАЛУЦКІ Аляксандр Віктаравіч** — першы намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама (80232751237);

**ДЗЯШКО Уладзімір Іосіфавіч** — намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама (80152735644);

**ДАМАНЕЎСКІ Уладзімір Віктаравіч** — старшыня Магілёўскага аблвыканкама (80222501869);

**СІРЭНКА Віктар Іванавіч** — намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама (80175004160);

**МАЦЕЛЬСКАЯ Ганна Мар'янаўна** — кіраўнік спраў Мінскага гарвыканкама (80172224444).

## Тры пытанні да ўлады

# НАБЫЦЬ... СЯДЗІБУ



**Ушацкі раён знаходзіцца ў цэнтры Віцебшчыны. На 45% тэрыторыі — лес. А Ушацкая група азёр — другая па велічыні ў краіне пасля Браслаўскай. Гэтыя фактары, як і іншыя акалічнасці краю, прыцягваюць сюды інвестараў. Многія праекты ўжо рэалізуюцца. Якія ўмовы стварае мясцовая ўлада для ўкладання капіталу ў рэгіён? «Звязда» спытала пра гэта намесніка старшыні Ушацкага райвыканкама Валянціну ХАМЕНАК.**

***— На віцебскім інвестыцыйным форуме, у павільёне, дзе быў прадстаўлены раён, дэманстравалася і прадукцыя на экспарт. З якімі краінамі вядзецца супрацоўніцтва?***

— Знешнегандлёвыя аперацыі прадпрыемствамі Ушаччыны ажыццяўляюцца з 10 краінамі свету, экспарт накіроўваецца ў восем краін. Асноўныя продажы — у Расійскую Федэрацыю — 63%. У Літву — 21%, Аўстрыю — амаль 9%. Нашу прадукцыю таксама купляюць у Казахстане, Эстоніі, Польшчы...

Рэалізуем рубленыя драўляныя канструкцыі, піламатэрыялы і іншае з дрэваапрацоўкі, тубы кардонна-папяровыя, кошыкі плеценыя, спажывецкія тавары і г. д.

Галоўны кірунак экспарту — турыстычныя паслугі. На іх прыпадае 74,5%. Асноўны экспарцёр — санаторый «Лясныя азёры». Ён пабудаваны на ўнікальным месцы, каля Баркоўшчынскай крыніцы. У яе жалезістыя і серныя воды не саступаюць па сваіх якасцях мінеральным водам Каўказа. Яны эфектыўна выкарыстоўваюцца для лячэння хворых рэўматызмам і паралічам нервовай сістэмы. У 2003 годзе, пасля ўвядзення ў строй новага лячэбнага корпуса, у пансіянаце праходзяць курс лячэння з захворваннем органаў дыхання, нервовай і сардэчна-сасудзістай сістэм, апорна-рухальнага апарату.

Брэндам раёна стала мінеральная вада «Вячэлле» Ушацкага агароднінасушыльнага завода. Здабываецца яна на глыбіні да 300 метраў.

У нас таксама наладжаны экспарт медыцынскіх паслуг: згаданым вышэй санаторыем і цэнтральнай раённай бальніцай.

***— Як сябе адчувае на Ушаччыне малы бізнес?***

— У раёне зарэгістравана каля 90 суб'ектаў малога бізнесу. А гэта 45% ад усіх формаў уласнасці. Дзейнічаюць і каля 170 індывідуальных прадпрымальнікаў. Найбольшая колькасць прыватных унітарных прадпрыемстваў — каля 53% — працуюць у сферы гандлю і грамадскага харчавання. У прамысловасці — 14%, будаўніцтве — 13,5%, транспарце — 13%.

Адна з прыватных структур — акцыянернае таварыства «Лес», акрамя таго, што займаецца вытворчасцю піламатэрыялаў, спецыялізуецца на перапрацоўцы ягад. Яго дражэ «Жураўіны ў цукры» карыстаецца добрым попытам. А прыватнае вытворчае прадпрыемства «Кват» робіць зборку спецыяльнага абсталявання, якое можа забяспечваць электрычнасцю невялікі пасёлак. Прадпрыемства «ПрамБудЛід» праектуе і вырабляе, а таксама манціруе драўляныя дамы...

***— Ці ёсць інтарэс у інвестараў да турыстычнай галіны?***

— Так. У нас каля 10 турыстычных сядзіб. Распрацавана прыблізна 30 маршрутаў для розных відаў транспарту, а таксама пешых.

Мы прапануем укладваць грошы ў гэты кірунак бізнесу. Даём магчымасць набыць аб'екты, якія не выкарыстоўваюцца. Сярод іх і будынак сядзібнага дома XIX стагоддзя ў аграгарадку Арэхаўна. Базы адпачынку можна стварыць у будынках былых школ, камбінатаў бытавога абслугоўвання. Рыхтуем спіс зямельных участкаў для стварэння турыстычнай інфраструктуры. Адпаведнае даручэнне было дадзена кіраўнікам дзяржавы.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.** *pukshanski@zviazda.by*

**Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказвае глыбокія спачуванні старшыні Брэсцкага абласнога Савета дэпутатаў Ашмянцаву Сяргею Дзмітрыевічу ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю БАЦЬКІ.**

# За кулісамі свята



**Жыхары ваеннага гарадка Уручча, асабліва тыя, чые вокны выходзяць акурат на страявы пляц ваеннай камендатуры, ужо амаль на памяць ведаюць, хто за кім пройдзе па мінскім праспекце Машэрава падчас ваеннага парада 3 ліпеня. У гэтыя летнія дні рэпетыцыі тут ладзяцца ледзь не штодзень — для многіх вялікі гонар удзельнічаць у адной з галоўных урачыстасцяў краіны.**



Менавіта пешая калона па традыцыі адкрые ўрачыстае шэсце, якое разгорнецца ў Дзень Незалежнасці на праспекце Машэрава. Першымі перад трыбунамі пройдуць юныя барабаншчыкі — выхаванцы Мінскага сувораўскага ваеннага вучылішча.

Суворавец Глеб Яршоў у парадзе ўдзельнічае ўпершыню. Хлопец не хавае, што вельмі хвалюецца. І ў першую чаргу таму, што трэба апраўдаць ускладзены на яго давер: перш чым трапіць у парадны разлік, выхаванцы вучылішча прайшлі сур'ёзны адбор. «Цябе выбралі — значыць ты самы лепшы, і гэтаму трэба адпавядаць, — лічыць падлетак. — Мой прадзед, які дайшоў да Берліна, думаю, вельмі ўзрадаваўся б, калі б даведаўся, што яго нашчадак — у парадным страі!».

Сцяг Перамогі і штандары 1-га, 2-га, 3-га Беларускіх і 1-га Прыбалтыйскага франтоў — менавіта гэтыя вайсковыя злучэнні ўдзельнічалі ў Беларускай стратэгічнай наступальнай аперацыі «Баграціён», у ходзе якой была вызвалена наша краіна, — следам за самымі юнымі ўдзельнікамі парада пранясуць вайскоўцы роты ганаровай варты. Але сваё майстэрства прыгажуны з шашкамі і карабінамі (у пляц-канцэрце разам з вайскоўцамі ўдзельнічаюць і прадстаўнікі ўнутраных войскаў Міністэрства ўнутраных спраў, Дзяржаўнага пагранічнага камітэта) па традыцыі прадэманструюць у канцы ўрачыстасці.

— Выступленне роты ганаровай варты сёлета запланавана больш рытмічным і відовішчным дзякуючы новым элементам, якія будуць выконвацца не пад ваенны марш, а пад сучасную музыку беларускага кампазітара, — раскрыў інтрыгу **камандзір зводнай роты ганаровай варты маёр Павел ШПАРЛА.**

Асобныя элементы вайскоўцы ў белых пальчатках пачалі развучваць яшчэ ў сакавіку. Пасля індывідуальнай падрыхтоўкі трэніраваліся сінхроннасці. Але самае складанае — рэпэтыцыі зводнай роты. Кіраваць калектывам у 118 чалавек Паўлу Шпарлу не ўпершыню. Як ён прызнаецца, бывала і больш. Дарэчы, для самога камандзіра роты гэта парад стане адзінаццатым. Тройчы ён удзельнічаў у якасці курсанта, столькі ж — як камандзір узвода, і ўжо пяты раз Павел выступіць як камандзір роты.



— Упершыню на сталічны праспект выйдуць войскі тэрытарыяльнай абароны, дзеля гэтых мэт прызваны і ваеннаслужачыя рэзерву, — расказаў **начальнік штаба — першы намеснік ваеннага каменданта Мінскай ваеннай камендатуры падпалкоўнік Сяргей ІВАНОЎ.** — Дагэтуль ніколі не ўдзельнічалі ў парадзе вайскоўцы 19-й і 6-й асобных гвардзейскіх механізаваных брыгад. Сёлета прынята рашэнне і аб тым, што ў парадныя разлікі ўвойдуць прадстаўнікі ўсіх брыгад сіл спецыяльных аперацый.

Акрамя таго, паўдзельнічаць у ваенным парадзе выпаў гонар і курсантам Ваеннай акадэміі Беларусі, ваенна-тэхнічнага факультэта БНТУ, вайскоўцам 120-й і 11-й асобных гвардзейскіх механізаваных брыгад. У складзе пешай калоны таксама пройдуць разлікі Дзяржаўнага пагранічнага камітэта, унутраных войскаў Міністэрства ўнутраных спраў, Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. Усяго — 20 парадных разлікаў.

Яшчэ 27 разлікаў — сучаснай ваеннай тэхнікі. Пасля таго як мінчане і госці сталіцы пабачаць усе амаль 220 адзінак баявой тэхнікі, каля якой, дарэчы, па заканчэнні парада можна будзе сфатаграфавацца, у небе над сталіцай з'явяцца асноўныя тыпы крылатых машын Ваенна-паветраных сіл і Войскаў супрацьпаветранай абароны.

Генеральныя трэніроўкі войскаў Мінскага гарнізона, якія сёлета пройдуць 24 і 28 чэрвеня каля абеліска «Мінск — горад-герой», ніколі не былі закрытымі для гледачоў. У тых, у каго на 3 ліпеня іншыя планы, ёсць магчымасць далучыцца да галоўнай урачыстасці краіны крыху раней.

**Вераніка КАНЮТА.**
*kanyuta@zviazda.by*
**Фота Надзеі БУЖАН.**

# ЦІ БУДУЦЬ НА ЦТ СТАБАЛЬНІКІ?

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Ці, напрыклад, камп'ютар можа няправільна «прачытаць» прозвішча абітурыента, таму і сертыфікат будзе выпісаны затым з памылкай у прозвішчы ці ў пашпартных звестках. Фактычна ў кожным дзясятым бланку даводзіцца выпраўляць памылкі ў рэгістрацыі. Хтосьці піша на рускай мове «*Викторовичь*», а хтосьці — «*Владзимеровичь*».

Арганізатары ЦТ канстатуюць, што акуратнасцю абітурыенты, на жаль, не вылучаюцца, а многія і ўвогуле замест друкаваных літар выкарыстоўваюць прапісныя. Некаторыя ўмудраюцца дапусціць памылкі ў рэгістрацыі ва ўсіх трох тэставых работах. А ёсць абітурыенты, якія ўвогуле забываюць з-за хвалявання запоўніць у бланку рэгістрацыйную частку. Пэўная колькасць абітурыентаў здаюць абсалютна чысты бланк адказаў, прычым і ў чарнавіку не назіраецца «слядоў» інтэлектуальнай работы.

Усяго на верыфікацыі задзейнічаны каля 250 чалавек, пераважна студэнткі (паколькі дзяўчаты больш падыходзяць для манатоннай работы) і маладыя педагогі. Верыфікацыя патрабуе максімальнай канцэнтрацыі ўвагі, таму рабочая змена доўжыцца чатыры гадзіны. З 9 гадзін раніцы да 21 гадзіны за камп'ютарнай тэхнікай змяняюцца тры змены. Дарэчы, для студэнтаў гэта добры спосаб падзарабіць. Але да прэтэндэнтаў ёсць два асноўныя патрабаванні — яны не павінны курыць (інстытут — зона, свабодная ад курэння) і не могуць удзельнічаць у тым годзе ў цэнтралізаваным тэсціраванні.

Кожны бланк праходзіць як мінімум трайную праверку вачамі, і кожны раз яго «чытае» новы верыфікатар. Апаратары выдаляюць і ўвесь бруд: напрыклад, абітурыент выпадкова чыркнуў ручкай, і, каб камп'ютар не залічыў яму няправільны адказ, гэта з элетроннай выявы прыбіраецца. Здараецца, што абітурыент з-за хвалявання дзве літары напісаў у адной клетачцы. Іх таксама расстаўляюць па сваіх клетках. Усё робіцца на карысць абітурыента. Пры гэтым камп'ютарная праграма фіксуе абсалютна ўсе ўмяшанні верыфікатара.

Не варта думаць, што апаратар (верыфікатар), які сядзіць за камп'ютарам, можа нейкім чынам умяшацца ў праверку работ. Пасля скaніравання ўсіх бланкаў электронная выява раздзяляецца на частку рэгістрацыі і частку адказаў. Адны апаратары правяраюць толькі рэгістрацыю, а другія — толькі адказы і нават не ўяўляюць, чый бланк знаходзіцца перад імі на экране. Да таго ж адказаў да тэставых заданняў апаратары не ведаюць. Яны рыхтуюцца толькі пасля таго, як работы ўдзельнікаў ЦТ прайшлі ўсе праверкі. Акрамя верыфікацыі (распазнавання рукапісных выяў), прадугледжаны яшчэ і тры апаратныя праверкі. Калі адказы нарэшце з'яўляюцца, яны ўносяцца ў камп'ютарную праграму і націсканнем адной кнопкі праз долі секунды з'яўляюцца ўсе 75 тысяч вынікаў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

■ Надвор'е

## Умерана цёпла, з дажджамі

**Адзін з плюсаў цяперашняга надвор'я: лёгка дыхаецца. Гэта заўсёды актуальна летам, асабліва для вялікіх гарадоў, адзначаюць сіноптыкі.**

Як расказалі ў Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды ўмерана цёплае няўстойлівае надвор'е захаваецца і ў выхадныя дні, не абыдзецца без кароткачасовых дажджоў. Так, у суботу, 24 чэрвеня, яны пройдуць ноччу па паўднёвым захадзе, удзень — у некаторых раёнах, магчымы навальніцы. Уначы 5—12 градусаў, удзень чакаецца 17—24 градусаў цяпла.

У нядзелю пацяплее, але не абыдзецца без кароткачасовых ападкаў. Уначы прагназуецца 10—16 градусаў. Днём 19—26, па поўдні — да 29 градусаў цяпла. У панядзелак удзень 17—24 градусы цяпла, па паўднёвым усходзе — да 28. Франтальныя раздзелы абумовяць ноччу пераважна па ўсходзе і паўночным захадзе, а ўдзень на большай частцы краіны кароткачасовыя дажджы. У аўторак будзе пераважна без ападкаў, толькі па поўначы краіны пройдуць кароткачасовыя навальнічныя дажджы. Уначы 7—14 градусаў цяпла, удзень 20—27 градусаў, па паўднёвым захадзе — да плюс 29.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by* ■

■ На слыху

## ХЛОПЧЫК НА ПАДАКОННІКУ ДЗЯВЯТАГА ПАВЕРХА...

**У Рэчыцы ратавальнікі развярнулі лесвіцу, каб патрапіць у кватэру, у якой на падаконніку адкрытага акна поўзала дзіця.**

Усё адбывалася на дзявятым паверсе дома па вуліцы Дастаеўскага. Праз пяць хвілін на месцы ўжо была аўталесвіца ратавальнікаў. Супрацоўніку РАУС удалося адцягнуць увагу малога размовамі праз зачыненыя ўваходныя дзверы — хлопчык спусціўся ў кватэру. А тым часам ратавальнікі падымаліся да акна. Пакуль міліцыя ехала па маму на работу, работнік МНС разам з дзіцем чакаў, калі яна адкрые дзверы. Па інфармацыі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, чатырохгадовы хлопчык хodзіць у дзіцячы сад, яго маці працуе прадаўцом. Дзякуючы зладжаным дзеянням міліцыі і ратавальнікаў трагедыі гэтым разам удалося пазбегнуць.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

## НОВЫЯ ЎМОВЫ ДЛЯ СТАМАТАЛОГІІ

**У Докшыцкай цэнтральнай раённай бальніцы, што на Віцебшчыне, працягваецца рэканструкцыя зубапратэзнай лабараторыі. Пасля завяршэння будаўнічых работ атрымаецца паўнацэннае стаматалагічнае аддзяленне з новым відам паслуг.**

Пакуль зубапратэзаванне адбываецца ў асобным корпусе, а зубалячэнне ажыццяўляецца ў паліклініцы. Наспела патрэба і ў поўнай замене абсталявання. «Рэканструкцыя зубапратэзнага корпуса ўжо амаль завершана, патрабуецца яшчэ дааснашчэнне, пасля чаго на новым месцы працягнуць працаваць 15 спецыялістаў-стаматолагаў, — адзначае **галоўны ўрач Докшыцкай цэнтральнай раённай бальніцы Сяргей КУБАР.** — Дзякуючы змяненням, з'явіцца і новы від паслуг — магчымасць вырабу металакерамічных зубных канструкцый».

**Святлана БАРЫСЕНКА.**
*protas@zviazda.by*

## ДВА ГАДЫ ТУРМЫ ЗА БРАКАНЬЕРСТВА

**Жыхар Камянецкага раёна атрымаў два гады пазбаўлення волі за незаконнае паляванне на аленя.**

33-гадовы вясковец паставіў петлі на жывёлу ў Бялянскім лясніцтве нацыянальнага парку «Белавежская пушча». У студзені ў пятлю папалася самка аленя. Тушу браканьер разабраў на месцы, але быў заўважаны супрацоўнікамі нацпарку.

У красавіку суд Камянецкага раёна вызначыў меру пакарання ў выглядзе двух гадоў калоніі агульнага рэжыму. З яго спагнана ў якасці кампенсацыі шкоды, нанесенай прыродзе, 6900 рублёў, а таксама 100 базавых велічынь штрафу.

Фігурант крымінальнай справы абскардзіў прыгавор. Але Брэсцкі абласны суд пакінуў рашэнне суда першай інстанцыі без змены.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
*yackevich@zviazda.by* ■

## АГУЛЬНАЯ ДЫКТОЎКА Ў ЦЭНТРЫ МІНСКА

**Разам з іншымі ўдзельнікамі вы напішаце дыктант па беларускай мове і зможаце праверыць свае веды. Стартуе ініцыятыва «Лідскага піва» 24 чэрвеня ў Нацыянальнай бібліятэцы. Чытаць тэкст будзе Іван Пінігін, акцёр Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы і іншых сцэн, рэжысёр, дырэктар тэлестудыі «Вока».**

Арганізатары падрыхтавалі спецыяльны тэкст пра Мінск. «Агульная дыктоўка» — падарунак да 950-годдзя горада жыхарам сталіцы, адзін з галоўных сёлета карпаратыўных праектаў кампаніі, якая прадастаўляе магчымасць кожнаму беларусу праверыць сваё валоданне беларускай мовай і падтрымаць імкненне ўдасканальваць свае веды. Усе дыктоўкі праверацць прафесійныя філолагі, вынікі дашлюць па электроннай пошце. Таго, хто атрымае 10 балаў, чакае прыз!

Збор удзельнікаў для рэгістрацыі: 12.00. Пачатак дыктанта: 12.30. Каб трапіць у залу, дзе адбудзецца дыктант, трэба прайсці праз правы бакавы ўваход бібліятэкі (з боку рэстарана «Мегаполіс», 2-і паверх).

Колькасць месцаў абмежавана, таму для ўдзелу ў дыктанце запоўніце, калі ласка, заяўку на сайце «Лідскага піва». Калі ёсць цяжкасці з рэгістрацыяй, дашліце інфармацыю з вашымі кантактнымі данымі на адрас marketing@lidskoe.by, і вам патэлефануюць, каб пацвердзіць рэгістрацыю.

**Святлана БАРЫСЕНКА.** *protas@zviazda.by*

# ПАХНЕ СЕНА ГАРАДСКОЕ



Тацццяна ГЕРЛІЦ, Ніна ФІЛІМОНЧЫК, Валянціна ПРАШКОВІЧ і Ніна ПРЫГАЖАЕВА.

**У пачатку сустрэчы Юрый ШЫПКІН, кіраўнік Наваполацкай спецаўтабазы, падзяліўся навіной: горад заняў першае месца па выніках рэспубліканскага агляду санітарнага стану і добраўпарадкавання сярод гарадоў з насельніцтвам звыш 50 тысяч чалавек.**



— Ведаеце, колькі ў Беларусі гарадоў з такой колькасцю насельніцтва? Вельмі многа. Так што прыемна, бо за гэтым стаіць і работа спецаўтабазы.

Свой адчувальны ўнёсак зрабілі і іншыя калектывы падчас традыцыйнага суботніка, у якім прынялі ўдзел каля 40 тысяч гараджан, падкрэслівае дырэктар. Дбаць пра родны Нафтаград, чысціню на яго вуліцах даўно стала адметнай рысай характару навапалачан. Праводзяцца штогадовыя агляды-конкурсы на найлепшае добраўпарадкаванне месцаў пражывання і адпачынку, а таксама тэрыторый прадпрыемстваў і арганізацый.

Пра чысціню і парадак яшчэ раз паклапаціліся напярэдадні Дня горада, які прайшоў нядаўна і стаў сапраўдным святам.

— А што датычыцца нашай спецаўтабазы, то працуем планава, а значыць без штурмаўшчыны. Галоўнае — арганізаваць належным чынам дзейнасць калектыву. Бо на справе кожны ведае «свой манеўр». Вы прыязджаеце да нас даволі часта і заўсёды бачыце чысціню вуліц, убранства плошчаў.



На вуліцы Паркавай — ямачны рамонт.

***— І ставім іх у прыклад іншым гарадам. Зараз кідаецца ў вочы, што вашы дызайнерыфларысты пайшлі на замену канфігурацыі малюнкаў зялёных упрыгажэнняў на вуліцах горада, на павелічэнне плошчы кветкавых кампазіцый.***

— Так яны больш прыкметныя, па-сапраўднаму яркія і святочныя, — згаджаецца дырэктар. — Пры гэтым мяняюцца наборы кветак і самі малюнкі — спецыялісты падыходзяць да задачы творча. У начальніка ўчастка азелянення грунтоўная адукацыя — закончыла Горацкую акадэмію, падрыхтавала да абароны кандыдацкую дысертацыю, так што справу ведае дасканала.

За той год, што вы не былі, людзей мы не страцілі, калектыў захавалі, — падкрэслівае Юрый Аляксандравіч. — Як заўсёды, рытмічна працуюць усе падраздзяленні: і брыгада па рамонце дарожнага пакрыцця і ўкладцы асфальту, і сам асфальтавы завод, і ўчастак «Гарсвятло», які клапоціцца пра належнае асвятленне вуліц, пра ашчадны рэжым работы аўтаматыкі і ўсяго абсталявання. Устанаўліваем толькі энергазберагальныя свяцільнікі. Участак гарсвятла выконвае таксама спецыялізаваныя вымярэнні, у тым ліку і ў жылых дамах.

Зараз хапае работы ў брыгады, што абкошвае тэрыторыі. Пацяплела, дачакаліся дажджоў і трава пайшла ў рост, толькі паспявай «махаць» «шчілем» ці «хускварнай». Затое вуліцы дагледжаныя, а па ўсім горадзе — водар маладога сена.

Свае задачы вырашаюць рабочыя па добраўпарадкаванні тэрыторый, дарожнікі — усе разам яны клапоцяцца пра вуліцы, тратуары, дарогі. Функцыянуе палігон для складзіравання ЦБА. Так што — працуем.

Каб адчуваць сябе больш упэўнена, знаходзім работу «на старане», — працягвае расказ дырэктар. — Напрыклад, асфальтавалі тэрыторыю па дагаворы падраду на стадыёне «Атлант». Тэхніка свая, людзі навучаны, і нават калі будзе многа заявак, мы справімся. Шукаць заказы дапамагае тое, што ў нас ёсць досыць унікальных механізмы. Шмат ахвотных на двухсекцыйны палівазапраўшчык, на прамысловы пыласос, самазвалдзесяцітоннік, а таксама на аўтакран, спецыяльную свідравальна-кранавую ўстаноўку і іншых жалезных памочнікаў. Знаходзім магчымасці — пры дапамозе горада — абнаўляць парк тэхнікі. У планах набыццё ўстаноўкі для асфальтавага пакрыцця ва ўмовах мінусавых тэмператур, так званага ямачнага рамонту.

Калектыў амаладжваецца, але калі людзі пенсійнага ўзросту жадаюць працаваць далей і працуюць нармальна, даём такую магчымасць. Ёсць у нас унікальны токар, ён вытачыць дэталь, за якую ніхто іншы не возьмецца. Надзвычай адказны і ўмелы чалавек. Хай працуе на здароўе.

...Знаёмімся з Тацццянай Герліц — тым самым спецыялістам, пра якога расказваў дырэктар. Тацццяна выпускніца аграбіялагічнага факультэта сельгасакадэміі, азеляненнем займаецца 15 гадоў. Сваю дысертацыю прысвяціла перспектыўным у паўночным рэгіёне Беларусі дзікарастучым раслінам.

— Гэта справа майго жыцця. З такім жа настроем працуе ўвесь калектыў участка азелянення — 35 чалавек, 20 з якіх непасрэдна заняты афармленнем вуліц, сквераў і плошчаў кветкамі. Расаду вырошчваем самі. Тое, што вы бачылі, — гэта пераважна з нашай жыццяздольнай, адсартаванай расады.

Асноўны час забірае догляд газонаў. У горадзе вельмі многа газонаў, і мы займаемся імі з красавіка па кастрычнік — трэба скошваць, грэбсці скошанае, падкормліваць...

— У азеляненні важна па-добраму здзівіць гараджан, — лічыць без пяці мінут кандыдат навук. — Нашы наватарскія крокі выклікаюць у іх разуменне, станоўчыя эмоцыі і падтрымку. Устанаўліваем новыя архітэктурныя формы ў мікраранах; змяніўся наш «матылёк», а яркі матылёк зрабіўся амаль сімвалам горада. Звярніце ўвагу, як прыцягваюць позіркі людзей яркія арабескі — кветнікі на газоне. Такая ж арабеска — з маладым кустоўем, аднагадовымі кветкамі і каляровай падсыпкай — з'явілася каля 4-й гарадской паліклінікі.

У нас дастаткова творчых людзей, сапраўдных мастакоў, здольных любы малюнак на паперы ўвасобіць у жывых кветках. У горадзе 7 тысяч квадратных метраў занятыя пад дагледжаныя, прыгожыя кветнікі, і сама лічба гаворыць пра наша стаўленне да прыроды. Толькі на бульвары імя Льва Наважылава, дзе мы цяпер знаходзімся, высаджана больш за 12 тысяч кветак. Прыгожа, праўда? І такая прыгажосць стала прыкметай гарадскога жыцця.

А намеснік дырэктара Іна Кулага палічыла важным назваць імёны самых лепшых работнікаў:

— Гэта сапраўдныя фанаты «зялёнага будаўніцтва» Ірына Марозава і Андрэй Касач; гаранчы работнік жыллёва-камунальнай гаспадаркі механізатар Сяргей Лабыр; начальнік аўтатрактарнай калоны Дзмітрый Кірэй — «Чалавек горада Наваполацка 2015 года»; прыбіральшчыца тэрыторыі Дар'я Багданава; галоўны інжынер Ігар Кудрын; электраманцёр Валянцін Заранка... Пералік можна працягваць, бо выдатна працуе большасць людзей.

Гутарыў **Уладзімір ХІЛЬКЕВІЧ.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**

УНП 391487274

# ЯШЧЭ МЕНШ СОЛІ, ЦУКРУ І ТЛУШЧУ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Навуковая супольнасць, медыкі і тэхнолагі харчовых прадпрыемстваў працягваюць працаваць над стварэннем прадуктаў здаровага, функцыянальнага харчавання, над паляпшэннем кантролю за бяспекай і якасцю, якія павінны адпавядаць і стандартам ЕАЭС. Расійскі бок наогул прапануе ўвядзенне на прасторах ЕАЭС святлафорнай маркіроўкі на кожным прадукце. Колеры будуць азначаць колькасць тлушчу, солі і цукру. Наша краіна абмяркоўвае такі крок, а пакуль працягвае зніжаць колькасць тых жа араматызатараў, замяняць іх натуральнымі спецыямі. Ёсць ужо мадэльныя ўзоры такіх прадуктаў, праз год можна чакаць іх на айчынным рынку.



**Правільна складзеная дзіцячая дыета дазваляе ўздзейнічаць на парушаны метабалізм, нармалізаваць работу стрававальнай сістэмы, актывізаваць абарончыя сілы арганізма.**

Нашы нацыянальныя стандарты павінны адпавядаць тэхнічным рэгламентам Мытнага саюза і Еўразійскага эканамічнага саюза, не супярэчыць міжнародным дакументам, аднак мы таксама можам прапісваць свае нарматывы, якія гарантуюць нам якасць і бяспеку айчыннай прадукцыі, адзначаюць спецыялісты. Нацыянальная база стандартызацыі не адмяняецца, што немалаважна, бо стандарты ў нас былі і застаюцца, бадай, самыя жорсткія.

Прадпрыемствы «Белтэхнахлеб» з дапамогай унікальнага прыбора вывучае зараз пшанічную муку першага гатунку з розных рэгіёнаў, каб даць адказ, якія вырабы з яе могуць атрымацца. Плануецца пашыраць і колькасць вырабаў з аўсянай мукі. А Полацкі хлебазавод хутка пачне пастаўляць у продаж хлябцы для цяжарных і кормячых жанчын — там будзе больш кальцыю і харчовых валокнаў. Вядуцца работы па стварэнні хлебабулачных вырабаў з паніжанай колькасцю солі, цукру, з дабаўленнем кальцыю і фоліевай кіслаты. На Нясвіжскім хлебазаводзе адпрацоўваюць тэхналогію хлебапячэння з выкарыстаннем хмелевых заквасак у пшанічных гатунках хлеба. Пінскі хлебазавод выпускае ўжо хлеб, тэрмін прыдатнасці якога падаўжаецца тэхналогіяй кансервацыі спіртам. Добра зарэкамендавала сябе і тэхналогія стэрылізацыі, якая без штучных дабавак падаўжае хлебу тэрмін прыдатнасці.

— Знешні выгляд хлеба застанецца ранейшым, аднак усё больш будзе з'яўляцца такіх вырабаў, якія дапамогуць палепшыць стан здароўя пэўных катэгорый насельніцтва з дапамогай комплексных дабавак з натуральнай сыравіны, — кажа **дырэктар унітарнага прадпрыемства «Белтэхнахлеб» Ларыса КАЛАСОЎСКАЯ.** — Хлеб ніколі не прыядаецца, яго можна ўжываць пастаянна, хоць у апошні час усе мы пачалі менш яго спажываць. Але зрэдку ён нам вельмі патрэбны. Заварныя гатункі маюць працяглы тэрмін прыдатнасці — дзякуючы працяглай тэхналогіі іх вырабу, дзесьці каля сутак. У гіпермаркетах прадаецца сэндвічны хлеб, асабліва замежнай вытворчасці, які дзякуючы кансервантам захоўваецца да шасці месяцаў. Нармальны тэрмін захоўвання — да шасці сутак. Іншы тэрмін дасягаецца вялікай колькасцю непатрэбных нам рэчываў. Дастаткова адкрыць пакет з такім прадуктам, як мы адчуем і прапіленгліколь, і воцатную кіслату, і г. д.

У дзіцячым харчаванні (і гэта таксама прагучала на кангрэсе) — не толькі самых маленькіх, але і старшакласнікаў — назіраецца дэфіцыт шэрагу карысных кампанентаў. Абмяркоўваўся і распрацаваны расійскім бокам пакет дакументаў дзяржстандартаў у дачыненні да дзіцячага харчавання, але мы іх не ўвялі, бо маем больш жорсткія ўласныя стандарты. Аднак завезеная з Расіі прадукцыя цалкам можа рэалізоўвацца на айчынным рынку.

Выраб дзіцячага асартыменту патрабуе сёння стварэння спецыялізаванай сыравіннай зоны — у першую чаргу для малочнай і мяснай прадукцыі. Адпаведныя патрабаванні могуць быць задаволены там, дзе вырошчванне і адкорм жывёл ажыццяўляюцца паводле экалагічна бяспечнай тэхналогіі, дзе адбываецца сістэматычны кантроль за таксічнымі рэчывамі ў глебе, кармах і прадуктах жывёлагадоўлі. Застаецца толькі прыняць адпаведныя дакументы.

Актуальным пытаннем застаецца ўзаемаразуменне паміж прадпрыемствамі, якія вырабляюць прадукцыю для дзіцячага харчавання, і гандлёвымі арганізацыямі, бо, на жаль, не існуе сёння абмежаванняў на ўстаноўленыя гандлёвыя надбаўкі, адзначае **загадчыца аддзела біятэхналогій Інстытута мясамалочнай прамысловасці НАН Беларусі Наталля ЖАБАНОС.** Сыравіна для дзіцячай прадукцыі выкарыстоўваецца пры гэтым толькі самай высокай якасці, упакоўка — дробная, а значыць дарагая, таму адпускны кошт ад пачатку большы, чым для іншай прадукцыі. Калі ж гандаль устанаўлівае яшчэ і надбаўку каля 40 працэнтаў, то сацыяльна арыентаваная дзіцячая прадукцыя трапляе ў сегмент прэміум-класа.

Дарэчы, ужо сфарміраваны пералік прадуктаў спецыялізаванага і дзіцячага харчавання для ўключэння іх у рацыён харчавання арганізаваных калектываў. Жорсткія патрабаванні да дзіцячага харчавання распаўсюджваюцца пакуль толькі на прадукцыю прамысловага выпуску і не распаўсюджваюцца на тое, што прапануецца ў арганізаваных калектывах дзіцячых садкоў, школ і г. д., дзе павінна выкарыстоўвацца прадукцыя прамысловай вытворчасці. У адукацыйных установах Масквы, дарэчы, навучэнцы ўжываюць толькі спецыялізаваныя каўбасныя і мясныя вырабы павышанай харчовай і біялагічнай каштоўнасці. Па аналогіі з расійскай праграмай «Школьнае малако» прапануецца і нам разгледзець магчымасць распрацоўкі праграмы забеспячэння дашкольнікаў і школьнікаў у арганізаваных калектывах парцыённымі разавымі ўпакоўкамі тых жа малочных прадуктаў. Айчынныя прадпрыемствы цалкам гатовыя забяспечыць садкам і школам мясныя паўфабрыкаты прамысловай вытворчасці — катлеты, шніцэлі, біфштэксы, каўбасы, кантроль якасці якіх ажыццяўляецца акрэдытаванымі лабараторыямі.

Не сакрэт, што харчаванне пры розных захворваннях з'яўляецца магутным лячэбным фактарам. Правільна складзеная дзіцячая дыета дазваляе ўздзейнічаць на парушаны метабалізм, нармалізаваць работу стрававальнай сістэмы, актывізаваць абарончыя сілы арганізма.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**
*protas@zviazda.by*



■ За кадрам

# Ты помніш, як усё пачыналася?..

**Напярэдадні свайго 15-годдзя тэлеканал АНТ запусціў у эфір серыю прома-ролікаў з дэвізам «Найлепшае — наперадзе!». Але, віншуючы калег, мы ўсё ж вырашылі акунуцца ў гісторыю і ўспомніць найбольш яркія, маштабныя і значныя тэлепраекты. Гідам у экскурсіі для чытачоў «Звязды» выступае чалавек, які шмат у чым зрабіў Агульнанацыянальнае тэлебачанне менавіта такім, якім мы яго сёння бачым, — дырэктар дырэкцыі спецпраектаў АНТ Анжэліна МІКУЛЬСКАЯ.**

## Пра першыя крокі

— Дакладна памятаю, з чаго пачалося маё супрацоўніцтва з тэлеканалам, — прыгадвае Анжэліна Уладзіміраўна. — Калі ў канцы 2006 года паступіла прапанова працаваць у камандзе рэаліці-шоу «Зорны цырк», я працавала ў Белтэлерадыёкампаніі над стварэннем прэміі «Трыумф», прысвечанай нашым славутым спартсменам, а таксама на навагоднім «Блакітным агеньчыку»... Загружанасць была проста надзвычайная, і я меркавала адмовіцца. Аднак Ягор Вячаслававіч Хрусталёў, які быў адным з кіраўнікоў тэлеканала, умеў весці перагаворы і пераконваць суразмоўнікаў. Таму (*смяецца.* — **Аўт.**) у адзін цудоўны момант я апынулася на пляцоўцы «Зорнага цырка» і вокамгненна ўцягнулася ў праект.

***— Які, успомнім на хвілінку, стаў першым «сваім» рэаліці-шоу не толькі для АНТ, але наогул для ўсёй Беларусі.***



«Мой бізнес» стаў своеасаблівым бізнес-інкубатарам для дзясяткаў беларускіх прадпрымальнікаў-пачаткоўцаў. Увосень у эфір выйдзе ўжо трэці сезон праекта!

Фота прадастаўлена прэс-службай АНТ.

— Так, ён быў першы, а таму вельмі шчыры і сапраўдны: гэта былі першыя траўмы, непадробныя эмоцыі і прамы інтэрактыў з гледачамі... Творчая каманда АНТ вельмі любіць і цёпла ўспамінае «Зорны цырк», хоць працаваць было насамрэч цяжка. Шоу выходзіла штотыднёва, у кожным выпуску праект пакідаў адзін з удзельнікаў, а ў астатніх на падрыхтоўку заставалася ўсяго чатыры дні. Уявіце, што такое за чатыры дні чалавеку, далёкаму ад цырка — тэлевядучаму, банкіру, хатняй гаспадыні, — навучыцца хадзіць па канаце або падрыхтаваць нумар з паветранай гімнастыкай, жангліраваць, засвоіць асновы дрэсуры?!

Зрэшты, для большасці гледачоў выклікі і пераадоленні рэаліці-шоу засталіся па-за кадрам. На выхадзе ж атрымаўся відовішчны, драматычны і эмацыянальны тэлепраект, пераможца якога, віцебскі настаўнік Павел Кежа, увайшоў у гісторыю як «тэлегерой з народа».

## Пра колькасць і якасць

«Адзін супраць усіх» і «100 мільёнаў», «Акадэмія талентаў» і «Музычны суд», «Бітва тытанаў» і «Зачыстка», «Тры халасцякі» і «Пасаг для нявесты», «Новыя галасы Беларусі» і «Я спяваю», адроджаны наноў конкурс «Міс Беларусь» і ўпершыню праведзены ў 2014-м «Містэр Беларусь», — мы гартаем у памяці разнажанравыя шоу, нібыта старонкі вялізнай кнігі. І пра кожны забаўляльны, інтэлектуальны, спартыўны, творчы праект мая суразмоўніца можа згадаць што-небудзь гэткае. Скажам, ці ведалі вы, што прыдуманы на АНТ «Пасаг для нявесты» нарадзіўся з дробязі? Аднойчы Рыгор Кісель, праглядаючы ранішнюю прэсу, убачыў заметку пра забег нявест недзе за мяжой. І беларускія нявесты таксама пабеглі па шчасце — а ў выніку, нагадаем, некалькі маладых пар сталі сем'ямі, у тым ліку алімпійскі чэмпіён па веславанні Аляксандр Багдановіч і пераможца шоу Валерыя Рудакоўская.

Наогул, гаварыць на гэту тэму можна бясконца: за 2007—2017 гады АНТ зняло каля 200 шматсерыйных тэлепраектаў. «Недзе ў 2013—2014 годзе ў адзін месяц адначасова ў запуску і пострадакшане ў нас былі 17 праектаў, зробленых адной і той жа камандай з 13 чалавек», — шакіруе лічбамі Анжэліна Мікульская.

***— Але як?!***

— Усё дзякуючы таму, што на АНТ вынайшлі, можна сказаць, ноу-хау, трэба патэнтаваць. Тут, я лічу, сапраўды ёсць чым ганарыцца, бо ўдалося стварыць зручную і прадуманую інфраструктуру, дзякуючы якой нават невялікімі сіламі можна здзейсніць вялізную колькасць праектаў. Зноў жа прыклад: здаецца, за 2012 год у нас выйшла 242 паўнавартасна падрыхтаваныя выпускі розных шоу — са сцэнарыямі, дэкарацыямі, касцюмамі, рэпетыцыямі і г. д.

Пры гэтым, сцвярджае суразмоўніца, за шмат гадоў праведзеных кастынгаў і многіх тысяч людзей, якія прайшлі праз адборы, яна памятае ўсіх. «Непасрэдна — усіх удзельнікаў усіх нашых праектаў, і шмат з кім падтрымліваю добрыя стасункі. Нават калі з памяці ў пэўны момант выпадзе імя ці прозвішча чалавека, я абавязкова ўспомню, дзе ён здымаўся і якая гісторыя была з ім звязаная. Бо ўсе матэрыялы з кастынгаў я вельмі доўга і скрупулёзна вывучаю, і да таго моманту, калі ўдзельнікам чарговага праекта скажуць «так», я ўжо ведаю іх, як родных: гэта яны мяне бачаць першы-другі раз, а я іх — сто пяцідзясяты...»

***— Давайце ўспомнім адзін з самых кранальных і душэўных праектаў тэлеканала — музычны дзіцячы конкурс «Я спяваю». Не шкадуеце, што ў ім пастаўлена кропка?***

— Для ўсяго ёсць свой час. На момант з'яўлення на экране «Я спяваю» быў надзвычай актуальным і важным. А сёння, звярніце ўвагу, на ўсіх расійскіх тэлеканалах пайшла бясконцая плыня дзіцячых праектаў і талент-шоу, і глядач імі, на жаль, ужо перанасычаны. У такой вялізнай масе губляецца дзіцячая ўнікальнасць і знікае той настрой, што выклікае ў адказ самыя шчырыя эмоцыі.



Памятаеце, у якім годзе на АНТ выходзіла гульня-віктарына «Я люблю Беларусь»?

Напэўна, трэба даць усім ахвотным магчымасць выказацца на дзіцячую тэму, а потым пераасэнсаваць яе наноў і знайсці тое, чаго на іншых тэлеканалах няма. Няхай сабе ўсе рыбкі плывуць у адзін бок, па цячэнні, а адна — у іншы. Натуральна, ёсць у гэтым рызыка быць незразумелым, але, дзякаваць богу, у нас хапае сіл і талентаў пераадолець інерцыю і зрабіць так, як ніхто не рабіў. У мяне, прызнаюся, у галаве сёння выспявае зусім новы праект, якім я літаральна хвараю. Вельмі хачу расказаць пра старых, выцягнуць з-за завесы маўчання і прыадкрыць гэтыя скарбніцы вопыту, мудрасці, жыццёвых гісторый, каб мы наноў пачалі цаніць гэтых людзей, захапляцца імі, праяўляць больш увагі не толькі да блізкіх, але і да суседзяў, знаёмых і нават незнаёмых.

***— Я зразумела, што немагчыма вылучыць адзін, самы любімы праект. А які быў самым складаным?***

— Напэўна, такімі былі аўтарскія праекты, якія мы вынаходзілі. Для параўнання: у сусветнага вытворцы тэлешоу, галандскага тэлевізійна-прадзюсарскага холдынга Endemol, што мае даччыныя кампаніі ў 23 краінах, найлепшыя праекты выбіраюцца наступным чынам. Раз на год усе філіялы прадстаўляюць свае задумкі, з якіх галоўны офіс выбірае 10—20 ідэй і вылучае ў сярэднім 10 мільёнаў долараў на распрацоўку кожнага. Потым гэтыя праекты здымаюцца і выпрабоўваюцца на аўдыторыі, а па выніках гэтага тэсціравання да продажу ў свеце выбіраецца добра калі адно тэлешоу — «Адзін супраць усіх», альбо «Фабрыка зорак», альбо «Адзін у адзін». На гэты момант у так званай біблії фармату вывераны, пралічаны і прапісаны ўсе нюансы і дробязі тэлепраекта. Дык вось, на гонар тэлеканалу АНТ, у нас ёсць шэраг арыгінальных праектаў, створаных ад пачатку да канца ўласнымі сіламі: «Пасаг для нявесты», «Міс Беларусь», «Я спяваю», «Акадэмія талентаў», «Талент краіны», «Гонар нацыі», «Ласкава запрашаем у Беларусь!», «Музычны суд» — з 2006 года мы налічылі больш як 170 сваіх праектаў.

Музычныя тэлеперадачы — можна сказаць, фірменны знак АНТ, які паспяхова робіць і навагоднія мюзіклы, і сольныя ці зборныя канцэрты артыстаў рознай велічыні («Песня года Беларусі», нацыянальная музычная прэмія «Ліра», «Музычныя вечары ў Мірскім замку» і г. д.). Трэнд апошніх гадоў — тэатральна-музычныя пастаноўкі, прымеркаваныя да Купалля. Не стане выключэннем і цяперашняе лета: восьмага ліпеня ў аграгарадку Александрыя Шклоўскага раёна адбудзецца відовішчнае эстрадна-цыркавое шоу «Купальскі сон».

***— У акцёраў ёсць роля-мара. А ў прадзюсара, рэжысёра, сцэнарыста ёсць тэлепраект-мара — яшчэ не зроблены, але вельмі жаданы?***

— Перадусім пра старых. А звыш таго... Хочацца зрабіць маштабны, нават міжнародны, праект, звязаны з космасам. У космас паляцелі ўжо турысты, чаму б не развіць гэту ідэю далей?

## Пра час прызнанняў

***— 25 чэрвеня АНТ святкуе 15-годдзе. У дзень нараджэння прынята рабіць падарункі і казаць прыемныя словы...***

— Я вельмі люблю тэлеканал АНТ, праўда. Гэта і родны дом, і 98% жыцця, і вельмі блізкія людзі. Я ўдзячная кіраўніцтву, якое стварыла для калектыву спрыяльныя ўмовы — не справаздачна-бюракратызаваныя, а сапраўды творчыя, у якіх насамрэч хочацца раскрыцца і працаваць на поўную. У нас, і гэта таксама дарагога каштуе, надзвычай дружалюбная атмасфера, у якой складваецца не серпентарый калег, а каманда паплечнікаў, прычым надзвычай лёгкая на пад'ём, мабільная каманда, — некаторыя пытанні можна вырашыць нават пасярод ночы. Я ні ў якім выпадку не ідэалізую абстаноўку, бываюць і складанасці, і шурпатасці — але перадусім у нас ёсць гонар за брэнд і адказнасць за яго перад гледачамі і самімі сабой. Наогул, я шчаслівая, што АНТ здарыўся ў маім жыцці, — мабыць, дзякуючы гэтаму адбылася і я — як рэжысёр, як чалавек, які здзяйсняе разнастайныя праекты. У іншым выпадку, напэўна, я была б проста добрай маці — а цяпер мае дзеці і бацькі мной ганарацца (*смяецца*).

***— Ганарацца, бо ёсць нагоды. Акрамя шэрагу ўзятых «Тэлевяршынь» успомнім уручаны вам сёлета медаль Францыска Скарыны. Такая высокая ацэнка саграве альбо абавязвае?***

— Абавязвае. Хлусіць не буду: калі ў пятніцу, 13-га, мне сказалі прыбыць на афіцыйны прыём ад імя Прэзідэнта, я, безумоўна, разумела, што проста так на падобныя мерапрыемствы не клічуць, але нават уявіць не магла, што атрымаю з рук Прэзідэнта такую ганаровую ўзнагароду, як медаль Францыска Скарыны. Падзея была нечаканай, хвалюючай і надзвычай прыемнай. І ўсё ж медаль — вялікая адказнасць: цябе высока ацанілі, адзначылі твой узровень, і далей проста нельга апускацца ніжэй за яго. Таму на наступны дзень ужо прыйшлі думкі, як узняцца на наступную прыступку, вышэйшую, і яшчэ вышэйшую — як у кнізе майго піянерскага дзяцінства «Чацвёртая вышыня». Усё самае цікавае — наперадзе!

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

*tselyashuk@zviazda.by*


## «СМАЧНАЕ ЛЕТА СА «ЗВЯЗДОЙ»

Калі вы падпісаліся на газету «Звязда» на III квартал або на II паўгоддзе 2017 года — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце да 8 ліпеня 2017 года ў рэдакцыю на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.



Набор мебели садовой Tarifa lounge wikbrw-std lounge

Сярод падпісчыкаў 12 ліпеня 2017 года будуць разыграны 7 мангалаў Forester і суперпрыз — набор садовай мэблі Tarifa longe. Вынікі будуць апублікаваны ў газеце «Звязда» да 22 ліпеня 2017 г.



Мангал Forester BC-781 с шампурами

Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі па 30 верасня 2017 г. пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на III квартал або II паўгоддзе 2017 г. і пашпарта. Пасля 30 верасня выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца. Умовы рэкламнай гульні «Смачнае лета са «Звяздой» чытайце ў нумары 95 газеты «Звязда» ад 23.05.2017 г.

Тэлефон для даведак: (017) 284 44 04.

Тэрмін правядзення гульні — з 26.05.2017 па 30.09.2017.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №3002 ад 16.05.2017 г. выдадзена Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь.

**Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на III квартал або II паўгоддзе 2017 года**

Прозвішча, імя, імя па бацьку ____________________

Падпіска аформлена і аплачана ў ____________________
(аддзяленне сувязі)
на III квартал або II паўгоддзе 2017 года

Хатні адрас і тэлефон (абавязкова) [ ] (індэкс) ____________________

Удачы ў розыгрышы!

## Серада, 28 чэрвеня

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.20** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.45** Зона Х.
**9.10, 10.05, 22.00 Серыял «След».*****
**10.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.00** Дзіцячы доктар.
**11.35, 12.10, 20.00 Серыял «Лесвіца ў нябёсы».***
**13.05** Дзень у вялікім горадзе.
**14.00 Серыял «Маёр і Магія».*****
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25** Нашы.
**15.45, 16.05** «Выратуйце нашу сям'ю».***
**17.35** Беларуская часінка.
**19.20, 0.05** Сфера інтарэсаў.
**21.00** Панарама.
**21.45** Актуальнае інтэрв'ю.
**0.40** Дзень спорту.
**0.50 Серыял «СМЕРШ».*****

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 22.05** Тэлебарометр.
**9.05, 18.35 Меладрама «Жамчужына палаца».***
**10.15** Рэальны свет.
**10.45, 16.30 Серыял «Кухня».*****
**11.50, 22.10** «Бітва экстрасэнсаў. 11-ы сезон. Апакаліпсіс».
**14.10, 17.35** «Паненка-сялянка». Рэаліці-шоу.
**15.20** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**16.05** «Багіня шопінгу». Фэшншоу.
**19.55** «Тата папаў». Сямейнае рэаліці-шоу.
**22.00** Спортлато 5 з 36, КЕНО.

### Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.40, 12.45** «Беларуская кухня». Карась запечаны.
**8.10, 12.00, 20.15** «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**8.25, 12.15, 14.50, 20.15, 22.50** «Гэты дзень».
**8.30, 18.55 «Фурцава». Драма.*****
**9.25, 13.15 «Дрэнны добры чалавек». Драма.***



**11.00, 14.55 «Чатыры танкісты і сабака». Маст. фільм.***
**12.20** «Наперад у мінулае».
**15.50** «Славянскі базар» у Віцебску-2010».
**17.10, 21.05** «Паляўнічыя на скарбы».*
**17.50, 21.45 «Сакрэтны фарватэр». Маст. фільм.***
**19.50** «Выпрабаванне». «Плошча рабоў. Тэрыторыя барацьбы».
**20.40** «Калыханка».

### Беларусь 5

**8.00** Спорт-кадр.
**8.30** Футбол. Кубак канфедэрацый.
**10.25** Лёгкая атлетыка. Камандны чэмпіянат Еўропы. Суперліга.
**12.40** Козел пра футбол.
**13.00, 18.30** Тэніс. Турнір WTA. Істбарн.
**16.45** Жанчыны і спорт.
**17.15** Час футбола.
**18.00** Слэм-данк.
**20.00, 23.05** Лёгкая атлетыка. Міжнародны турнір. Астрава.
**20.55** Футбол. Кубак канфедэрацый. 1/2 фіналу. (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
**22.55** Спорт-цэнтр.

### АНТ

**6.00, 6.30, 7.00** (з субцітрамі), **7.30, 8.00** (з субцітрамі), **8.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05, 8.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здарова!»*
**10.20** «Смак».*
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15** (з субцітрамі), **21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Модны прыгавор».
**12.10, 0.10** «Сам-насам з усімі».***
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».***
**14.15, 16.20** «Час пакажа».***
**16.55** «Давай пажэнімся!»***
**18.20** «Кантрольная закупка».
**18.55** «Удача ў прыдачу!» Дзённік.
**19.00** «Няхай гавораць».***
**20.00** Час.
**21.05 Серыял «Мажор-2».*****
**23.10 Серыял «Лонданград».*****
**1.00** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10. 23.00** «СТБ-спорт».
**8.30, 23.05** «Тайны Чапман».***
**9.25** «Далёкія сваякі».***
**9.35, 17.35** «Званая вячэра».***
**10.40, 18.35** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы».***
**11.30, 22.00** «Глядзецьусім!»***
**11.50, 23.55 «Энігма». Серыял.*****
**13.50** «Тэрыторыя памылак».***
**15.30** «Вадзіць па-руску».***
**16.05** «Аўтапанарама».
**16.50 «Салдаты і афіцэры». Серыял.*****
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Сакрэтныя тэрыторыі».***

### МІР

**6.10, 10.30** М/ф «Маша і Мядзведзь».0
**7.00** Добрай раніцы, свет!***
**8.35** «Няма праблем».***
**10.00** «Цяжар абеду».*
**10.40** «Любімыя акцёры», Уладзімір Зельдзін.*
**11.10 Маст. фільм «Аршын Мал Алан».0**
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15 Маст. фільм «Механік».*****
**15.00** Дак. фільм «Сямейныя драмы».***
**16.15 Серыял «Вяртанне Мухтара-2».*****
**19.20, 2.40 Серыял «Закон і парадак».*****
**23.10 Маст. фільм «Закінутыя ў лясах».*****
**1.00 Маст. фільм «Кухар для прэзідэнта».***
**5.45** М/ф.0

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.40** «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым.
**12.00** «60 хвілін». Ток-шоу.
**13.20** «Пакой смеху».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.35** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.40** «Прамы эфір».
**17.20 Серыял «Пыльная работа».**
**19.15, 20.40 Серыял «Тэрмінова ў нумар!»**
**22.00, 23.10 Серыял «Добрае імя».**
**0.40** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**6.05** Кватэрнае пытанне.0
**7.10, 8.05 Серыял «Вісякі».*****
**8.55 Серыял «Вяртанне Мухтара».*****
**9.45, 23.00** «НЗ.by».
**10.20 Серыял «Ляснік».*****
**12.00** Суд прысяжных.***
**13.25, 16.30** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.00 Серыял «Дазнаўца».*****
**17.05 Серыял «Сведкі».*****
**19.40 Серыял «Марскія д'яблы. Смерч».*****
**23.20** «Вынікі дня».
**23.50 Серыял «Пагоня за цянем».*****

### 8 канал

**7.00, 15.55, 19.10, 21.00, 23.55** «Надвор'е».
**7.05** М/ф «Тайна трэцяй планеты».
**8.00 Серыял «Выратаваць боса».**
**8.50, 17.30 Серыял «Грандатэль».**
**10.15** «Сябры дзядулі Марка».
**10.30** «Адшукваецца адпачынак».
**11.00 Драма «Чэмпіёны».**
**12.40, 19.15 Серыял «Шэрлак».**
**14.15 Камедыя «Пашпарт».**
**16.00** «Мультпарад». М/ф «А баба Яга супраць».
**16.40 Серыял «Паміж намі кажучы».**
**18.40** «Мой любімы гадаванец».
**20.50** «Вечарніца».
**21.05 Меладрама «Жанчына французскага лейтэнанта».**
**23.10 Серыял «Тыран».**

### ВТБ

**6.00, 14.10** Серыял «Варонiны».***
**8.00, 4.20** «Ералаш».0
**8.30, 3.20** М/ф «Ёка».0
**8.55, 3.45** М/ф «Смяшарыкі».0
**9.15, 4.05** М/ф «Маша і Мядзведзь».0
**9.30, 19.00** Серыял «Дах свету-2».***
**10.30** Камедыя «Маё вялікае грэчаскае вяселле».*
**12.20** Скетч-шоу «6 кадраў».***
**12.40, 2.15** «Дурні і дарогі».***
**13.10, 20.00** Серыял «Вечны водпуск».***
**16.20** Серыял «Закрытая школа-3».***
**17.20, 0.50** Серыял «Васьмідзясятыя-6».***
**17.50, 23.00** «Уральскія пельмені».***
**21.00** Камедыя «Вясельная вечарынка».*
**0.00** Серыял «Карабель».***
**1.15** «Лаві момант».***
**1.35** Серыял «Бязмоўны сведка».***
**2.35** «Не можа быць!»***
**5.10** Серыял «Метад Лаўровай».***

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.30, 23.30** Навіны культуры.
**10.15, 1.55** «Назіральнік».
**11.15, 16.40, 23.20** Кінаапазія. Мікіта Аленеў чытае верш Юрыя Левітанскага «Ну што з таго, што я там быў...»
**11.20, 21.50** «Каломба». Серыял.
**13.00** «Георгій Свірыдаў. Слых эпохі». Дак. фільм.
**13.40** «Пешшу...» Масква хлебасольная.
**14.05, 20.25** «Вялікае рассяленне чалавека». Дак. серыял.
**15.10** «Справа N. Далучэнне Крыма, стагоддзе XVIII-ае».
**15.35** «Дождж у чужым горадзе». Маст. фільм. 2-я серыя.
**16.45** «Інтэлектар Гарохава». Дак. фільм.
**17.25, 1.40** Сусветныя скарбы.
**17.40** Дзяржаркестр імя Я. Ф. Святланава. С. Рахманінаў. Сімфонія №2.
**18.45** Дак. фільм. «Пошукі жыцця». Дак. фільм.
**19.15** «Добрай ночы, малыя!»
**19.45** «Абсалютны слых».
**21.20** «Адлюстраваны час». Дак. серыял.
**23.45** Мастсавет.
**23.50** «Культурная рэвалюцыя».
**0.35** «За ўсё ў адказнасці». Маст. фільм. 1-я серыя.

### Настальгія

**6.00** «СевАлогія з Севам Наўгародцавым: «Дыскатэкі 80-х».****
**7.05, 9.40, 11.00, 11.40, 13.55, 15.40, 17.00, 17.45, 21.40, 23.00, 23.40, 5.35** Музычная настальгія.*
**7.20** Маст. фільм «Добры дзень, я ваша цётка!»***
**9.00, 15.00, 21.00** «Мінулы час».*
**10.00, 16.00, 22.00** «Народжаныя ў СССР».*
**11.30** «Сядзі і глядзі». Музычна-парадыйная праграма.***
**12.00** «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «МММ» і іншыя». 2007 год.***
**12.50** Праграма «Тэма» з У. Лісцьевым: «Праблема грошай». 1993 год.***
**13.35** «Час пік» з Уладзіславам Лісцьевым. Сяргей Цігіпка. 1994 год.***
**14.15** Тэлеспектакль «Пяцьмільёнаў». 1968 год.***
**17.20** Дак. фільм «Вялікі містыфікатар».*
**17.55** «Спяем, сябры!» з Тацыянай Візбар. 2007 год.*
**18.55** Маст. фільм «Прыгажун-мужчына».***
**23.30** «Сядзі і глядзі». Музычна-парадыйная праграма.***
**0.00** «Акулы пяра». Аляксандр Градскі. 1998 год.*
**0.50** Праграма «Вясёлыя рабяты». 1990 год.***
**3.00** Фільм-спектакль «Мір дому твайму». 1987 год.***

### EuroSport 1

**3.30, 10.30, 23.00, 1.00** Зімовыя віды спорту. «У пагоні за гісторыяй». Ліндсі Вон.
**4.00, 8.00, 11.30, 1.30** Тэніс. Турнір АТР.
**5.30, 9.30** Аўтагонкі. Серыя WTCC.
**7.00, 11.00** Футбол. Чэмпіянат MLS.
**10.00** Матагонкі.
**21.05** Веласпорт. «Тур дэ Франс»-2016.
**22.00** Снукер. «Мастэрс». Фінал.
**23.30** Футбол. «ФІФА».
**0.05** Лёгкая атлетыка. Камандны чэмпіянат Еўропы.
**2.30** Веласпорт. «Джыра-д'Італія».

### Кінакамедыя

**0.10** Камедыя «Мільён для чайнікаў».***
**2.00** Камедыя «Шалёныя грошы».***
**3.50** Камедыя «Уцёкі».***
**5.35** Камедыя «Вялікае вяселле».***
**7.15** Камедыя «Ну ты і прыдурак!»***
**9.00** Меладрама «Лос-Анджэлеская гісторыя».***
**10.45** Камедыя «Глыток».****
**12.25** Камедыя «Дом з паранармальнымі з'явамі».***
**14.00, 14.50, 15.40** Скетчкам «Паміж намі».***
**14.20, 15.10** «Камедыянты (Шоу)».***
**16.00** Камедыя «Тата напракат».*
**17.50** Камедыя «Дазвольце цябе пацалаваць... На вяселлі».***
**19.30** Камедыя «Сутэнёр».***
**21.10** Прыгоды «Факап, або Горш не бывае».***
**23.15** Прыгоды «Вікі».***

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**7.40** «Шафа».***
**8.30** «Доктар І...»***
**9.00, 19.00, 3.45** «Вузел лёсу». Серыял.***
**10.30** «Судовыя страсці». Дак. серыял.***
**12.10** «Сляпая».*
**13.10** «Варажбітка».*
**14.15, 5.10** «Паралельны свет».*
**15.15** «Трэндзі».***
**15.45** «Здзелка».***
**16.15** «Натуральны адбор».*
**17.10** «Шчыра».*
**18.05** «Самара». Серыял.***
**20.45** «Магазіна».***
**21.45** «Рэвізора».***
**23.05** «Лінія абароны».***
**23.40** «Звышнатуральнае». Серыял.***
**0.25** «Рыцар дня». Баявік.*
**2.05** «Амерыканскі жаніх».***

### ТБ1000

**6.10** Зззянне.***
**8.30** Баец.***
**11.05** Пазаземная рэха.*
**13.05** Чалавек, які змяніў усё.***
**15.45** Да чагосьці прыгожага.****
**17.55** Практычная магія.***
**20.10** Як баязлівы Роберт Форд забіў Джэсі Джэймса.***
**23.20** Адвакат д'ябла.***
**2.10** Версія.***
**4.25** Фрэнк.***

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Супердрэнныя.****
**7.50** Выкрутасы.*
**9.50** Як я правёў гэтым летам.***
**12.20** Цырк.0
**14.15** Жаніх.*
**16.15** Гэта твой дзень.0
**18.10** Дамавік.***
**20.20** Здзіві мяне.***
**22.20** Экспірыенс.***
**0.20** Асабісты нумар.*
**2.30** Зялёная карэта.***
**4.20** Каляфутбола.***

### National Geographic

**6.00, 13.20** Гульні розуму.*
**6.50, 14.05** Навуковыя недарэчнасці.*
**7.45, 10.10, 14.50** Мегазаводы.*
**8.35, 11.00, 15.40** Міжнародны аэрапорт Дубай.*
**9.20** Геній.***
**11.45, 16.25, 19.30, 23.25, 2.35** Расследаванні авіякатастроф.*
**12.30, 18.40, 21.50, 1.40, 5.05** Гісторыя Бога з Морганам Фрыменам.***
**20.15** Аўта-SOS.*
**21.00, 0.55, 4.15** Інстынкт выжывання.***
**22.40** Сваіх не кідаем.***

### Discovery

**8.00, 14.00, 0.00, 3.50** Зорнае выжыванне.***
**9.00, 15.30, 21.30, 5.55** Як гэта ўстроена?*
**9.30, 15.00, 21.00, 5.30** Як гэта зроблена?*
**10.00, 16.00, 23.00, 7.10** Паляўнічыя на рэліквіі.*
**10.30, 16.30, 23.30, 2.00, 7.35** Паляўнічыя на склады.***
**11.00** Майстры патаргаваць.*
**17.00, 22.00, 6.20** Махінатары.*
**18.00** Як устроены Сусвет.*
**19.00** Як устроена Зямля.*
**20.00** Скарб Купера.*
**1.00** Бітва з акіянам.*
**2.55** Як працуюць машыны.*
**4.40** Маланкавыя катастрофы.***

## Усходні гараскоп на

**АВЕН.** Інтуіцыя — ваш верны і надзейны сябар. Магчымы ўдзел у якіх-небудзь інтэлектуальных праектах. Не плануйце залішняй нагрузкі на працы. Не фарсіруйце падзеі і не спрабуйце рабіць дзесяць спраў адначасова. У аўторак парадуюць падзеі ў асабістым жыцці. У пятніцу давядзецца адстойваць свае інтарэсы. У выхадныя адпачніце разам з сябрамі. У гэты час добра прымаць гасцей або весці работу па хатняй гаспадарцы. Дарэчы, у суботу вы можаце знайсці новага сябра.

**ЦЯЛЕЦ.** Прыслухайцеся да парад сяброў і калег па працы, якім давяраеце. А вось грошы ў сумесны бізнес зараз укладваць непажадана. Пачынаючы з сярэдзіны тыдня, графік работы можа стаць вельмі напружаным, паспрабуйце не вельмі стаміцца да гэтага часу. Лепш трохі прыпыніць свой тэмп, успомніўшы пра тое, што ўсіх грошай не заробіш, і дазволіць сабе невялікую перадышку. Падумайце пра будучыню, цяпер самы час завесці сям'ю.

**БЛІЗНЯТЫ.** Пазбягайце кардынальных перамен у любых галінах дзейнасці. Ваша мэтанакіраванасць дазволіць дасягнуць немагчымага, але дзейнічаць трэба строга па плане. Сутыкненне з нязначнымі цяжкасцямі толькі дадасць унутранай упэўненасці ў сабе і рашучасці, што дазволіць з лёгкасцю іх пераадолець. Вашы ідэі будуць станоўча ўспрыняты начальствам і калегамі. Інтарэс да справы спрацуе больш на вашу рэпутацыю, чым на заробак, але і тое, і другое будзе знаходзіцца на прыстойнай вышыні. У выхадныя займайцеся творчасцю, сустракайцеся з сябрамі. Неабходна здымаць нервовыя перагрузкі.

**РАК.** Надыходзіць спрыяльны перыяд. Цяпер якраз той момант, калі хочацца цалкам аддацца летняму настрою. Ужо ў панядзелак вас чакае поспех, які дазволіць адчуць лёгкасць на сэрцы. Чацвер прынясе невялікую але важную ўдачу, і вы адчуеце, як свет любіць вас. Радасць захопіць у сваё абдымкі і закруціць у вясёлым танцы. У нядзелю варта крыху адпачыць ад мітусні — напрыклад, зладзіць сабе маленькае падарожжа або шпацыр.

**ЛЕЎ.** Удалы час для розных каштоўных набыткаў, укладання грашовых сродкаў, дзеянняў, накіраваных на ўмацаванне свайго матэрыяльнага становішча. Аўторак і субота — добрыя дні для зносін са сваякамі. Нават уладальнікі самага складанага характару будуць мілыя і пакажуць сябе з лепшага боку. Калі чацвер не будзе занадта напружаным працай, лепш правесці яго ў кампаніі сяброў. На абяцанні, якія будуць атрыманы вамі ў суботу, асабліва спадзявацца не варта. Нядзеля — выдатны дзень для правядзення даследаванняў і эксперыментаў.

**ДЗЕВА.** На гэтым тыдні добра пойдуць справы, у якіх патрабуецца актыўнае ўкладанне сіл, але не тыя, якія не змогуць абысціся без дакладнага і паслядоўнага кіраўніцтва. У пачатку тыдня пастарайцеся быць пунктуальнымі і не спазняйцеся на працу. Калі кудысьці адпраўляецеся, то прыходзьце ў патрэбнае месца загадзя. У панядзелак будзьце адкрытыя для навакольных, старайцеся весці сябе шчыра з усімі, з кім давядзецца мець зносіны. У чацвер з'явіцца магчымасць праявіць свае самыя лепшыя якасці, так што не спрачайцеся з-за дробязяў. У выхадныя вашы планы могуць раптам сарвацца па абставінах ад вас не залежных.

## Субота, 1 ліпеня

### Беларусь 1

6.20 Існасць.
**6.50 Камедыя «Белыя росы».***
8.25 Кулінарная дыпламатыя.*
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
9.10 Здароўе.*
10.00 Дача.*
10.35 Вялікі сэлфі-тур.*
11.10 50 рэцэптаў першага.*
**12.10 Серыял «Байкі Міцяя».***
**13.10 Камедыя «Дазвольце цябе пацалаваць... Зноў».*****
15.15 Краіна.
**15.45 Камедыя «Дазвольце цябе пацалаваць... На вяселлі».*****
**17.30 Меладрама «Застаньцеся назаўсёды».*****
21.00 Панарама.
21.40 Урачысты сход і святочны канцэрт майстроў мастацтваў Беларусі, прысвечаныя Дню Незалежнасці Рэспублікі Беларусь (Дню Рэспублікі).
23.10 Дзень спорту.
**23.20 Маст. фільм «У бой ідуць адны «старыя».***

### Беларусь 2

7.05, 13.50 «Анлайн 2.0». Скетчкам.***
7.35, 22.05 Тэлебарометр.
**7.40 Фільм для дзяцей «Спячая прыгажуня».***
**8.45 Серыял «Шчаслівыя разам-5».*****
9.40, 19.50 «Тата папаў». Сямейнае рэаліці-шоу.***
11.45 Вяселле без баяна.*
**12.20 Анімацыйны фільм «Кунг-фу Панда».**
14.25 «Моду народу».***
15.20 Капейка ў капейку.*
15.55 Два рублі.*
**16.15 Драма «Выратаваць радавога Раяна».*****

19.00 Рэпарцёр.***
22.00 Спортлато 6 з 49, КЕНО.
**22.10 Драма «Старое ружжо».***

### Беларусь 3

7.25 «Сіла веры».
7.50, 12.20, 20.15 «Калейдаскоп». Навіны культуры.
8.05, 12.35, 20.30, 22.40 «Гэты дзень».
8.10 «Беларуская кухня». Цярцюха і гарохавыя аладкі.
**8.40 «Лятучая мыш». Мюзікл.***
10.55 «Я хачу гэта ўбачыць!» Траса М4.
11.25 «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
11.50 «Навукаманія».
**12.40 «Жандар з Сен-Трапэ». Камедыя.***
14.15 «Апошні дзень». Клара Лучко.*
14.55 «Камертон». Народны артыст Беларусі Мікалай Скорыкаў.
**15.20 «Паласаты рэйс». Камедыя.***
16.45 Юбілейны канцэрт ансамбля народнай музыкі «Бяседа».
**18.15 «У жніўні 44-га...» Драма.***
20.40 «Калыханка».0
**21.05 «Сем нявест яфрэйтара Збруева». Камедыя.***
22.45 Сусветная класіка. Joe Cocker. Fire it Up Live.

### Беларусь 5

8.00 Тэніс. Турнір WTA. Істбарн. 1/2 фіналу.
10.00 Пляжны футбол. Кубак Дружбы. Літва — Беларусь.
11.15 Змяшаныя адзінаборствы. UFC Fight Night.
13.20 Пляжны футбол. Кубак Дружбы. Азербайджан — Літва.
14.25 «На шляху да ЧС-2018». Відэачасопіс.
14.55, 23.20 Пляжны футбол. Кубак Дружбы. Беларусь — Турцыя.
16.10 Тэніс. Турнір WTA. Істбарн. Фінал.
18.35 «Вялікі спорт». Токшоу.
19.20 Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. БАТЭ — «Гарадзея». (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
21.20 Лёгкая атлетыка. Брыльянтавая ліга. Парыж.

### АНТ

7.00, 9.00, 16.00 (з субцітрамі), 20.30 Нашы навіны.
**7.05 Серыял «Лонданград».*****
9.05 М/с «Смяшарыкі. Новыя прыгоды».0
9.20 «Здароўе».***
10.30 «Смак».*
11.10 «Ідэальны рамонт».
12.10 «Разумніцы і разумнікі».*
13.20 «Удача ў прыдачу!» з «Еўраоптам».
14.25 «Вакол смеху».
16.15 (з субцітрамі), 21.00 Навіны спорту.
16.20 «Ералаш».
16.45 «Хто хоча стаць мільянерам?»
17.45 «Кропля ў кроплю».***
21.05 «Сёння ўвечары».***
22.35 Канцэрт Максіма Галкіна.
**0.35 Камедыя «Жаніх з таго свету».*****

### СТБ

6.10 «Салдаты і афіцэры».***
7.50 «Тайны Чапман».***
8.40 «Самыя шакіруючыя гіпотэзы».***
9.30 «Рамонт па-сумленнаму».***
10.10 «Самая карысная праграма».***
11.00 «Мінск і мінчане».
11.35 «Бітва за неба».***
13.15 «Усім па катку».***
13.30, 16.30, 19.30 «24 гадзіны».
13.40 «Адкрытая размова».
**13.55, 1.05 Камедыя «Сцеражыся аўтамабіля».***
15.35 «Далёкія сваякі».***
15.55 «Вялікі горад».
16.40 «Уся праўда пра Марс».***
**17.35 Маст. фільм «Усё, што нам патрэбна...»***
20.00 «СТБ-спорт».
20.10 «Засакрэчаныя спісы. 7 з'яў, якіх не можа быць!»***
**21.50 «Белыя ваўкі». Серыял. Заключныя серыі.*****

### МІР

6.00 М/ф «Маша і Мядзведзь».0
7.50 «Саюзнікі».*
8.20, 3.45 М/ф.0
9.00 «Вой, мамачкі!»*
9.30 «Любімыя акцёры», Георгій Тараторкін.*
10.00, 16.00 Навіны (бягучы радок).
10.15 «Здабытак рэспублік».*
**10.45 Маст. фільм «Чыста англійскае забойства».0**
**14.00 Маст. фільм «Дамы запрашаюць кавалераў».**
15.30 «Цяжар абеду».*
**16.15 Серыял «Маша ў законе».*****
**23.20 Серыял «Мафіёза».*****
**2.25 Маст. фільм «Першая пальчатка».0**

### РТР—Беларусь

7.00 «Пакой смеху».
**7.40 Серыял «Сямейны дэтэктыў».**
11.00, 14.00 Весткі.
11.30 «Жывыя гісторыі».
12.20 «Пяцёра на аднаго».
13.10 «Наша справа».
**13.25, 14.30, 20.55 Серыял «Толькі ты».**
19.00 «Карціна свету».
19.55 Надвор'е на тыдзень.
20.00 Весткі ў суботу.
**22.40 Маст. фільм «Каханне гаворыць».***

### НТБ—Беларусь

6.20 «Астрапрагноз».
6.25 «Зоркі сышліся».***
8.00, 10.00, 16.00 Сёння.
8.15 «Урачэбныя тайны плюс».*
8.50 «Прыгажосць па-руску».***
9.40 «НЗ.by».
10.25 Галоўная дарога.***
11.05 «Ежа жывая і мёртвая».*
12.10 Кватэрнае пытанне.0
13.20 «Удача ў прыдачу!»
**14.20 Серыял «Марскія д'яблы. Смерч. Лёсы».*****
16.20 «Следства вялі...»***
17.10 «Сакрэт на мільён». Святлана Пермякова.***
19.00 «Цэнтральнае тэлебачанне».
20.00 «Ты не паверыш!»***
**20.40 Маст. фільм «Ультыматум».*****
0.00 «Экстрасэнсы супраць дэтэктываў».***

### 8 канал

9.00, 15.55, 19.00, 21.15, 23.55 «Надвор'е».
9.05 «Сябры дзядулі Марка».
9.30 «Даведнік па краінах і кантынентах».
**9.45 «Сінематограф». Маст. фільм «Закон ёсць закон».**
**11.10 Драма «Слёзы сонца».**
**13.10 Трылер «Шостае пачуццё».**
15.00 «Глядзім усёй сям'ёй». М/ф «Чыпаліна».
16.00 «Адшукваецца адпачынак».
16.30 «Вяселле па разліку».
17.00 «Мультпарад».
**17.15, 19.05 Маст. фільм «Блакада».**
20.50 «Вечарніца».
21.00 «Фэшн is my прафэшн».
21.20 Вестэрн «Золата Макены».
23.30 Дак. фільм «Дыялогі з усім светам».

### ВТБ

6.00, 1.50 «Турбаміксер».***
6.30 Скетч-шоу «6 кадраў».***
7.30 Серыял «СуперМакс».***
8.30 М/ф «Егіптус».0
9.00, 3.00 М/ф «Тры каты».0
9.20, 3.20 М/ф «Смяшарыкі».0
9.40, 3.40 М/ф «Маша і Мядзведзь».0
10.00, 2.30 «Ералаш».0
11.20 Анімацыйны фільм «Чырвоная шапка супраць зла».*
13.00 Серыял «Вы ўсе мяне прыводзіце ў шаленства».***
15.00 Камедыя «Нявеста, якая ўцякла».*
17.15, 19.00 «Уральскія пельмені».***
20.40 Фантастыка «Трансформеры: помста паўшых».*
23.35 Жахі «Слізняк».***
1.20 «Сэрцы за каханне».***
4.00 «Лаві момант».***
5.00 «Дурні і дарогі».***

### Культура

6.30 «Еўраньюс».
10.00, 23.30 «Без года тыдзень». Маст. фільм.
11.10 «Мікалай Кручкоў». Дак. фільм.
11.50, 16.00, 17.30 Кінапаэзія. Аляксей Вярткоў чытае верш Сашы Чорнага «Пад сурдзінку».
12.05, 1.55 «Жывая прырода Індакітая». Дак. серыял.
12.55 «Перадзвіжнікі. Іван Крамской». Дак. фільм.
13.25 «Чалавек ці робат?» Дак. фільм.
14.20 Ілюзіён. «Жудасныя бацькі». Маст. фільм.
16.05, 0.40 «Міры Фёдара Хітрука». Дак. фільм.
17.35 Па слядах тайны. «Што было да Вялікага выбуху?»
18.20 «Рамантыка рамансa».
19.35 «Лінія жыцця». Паліна Куцепава.
20.30 «Вас выклікае Таймыр». Маст. фільм.
22.00 Легендарныя канцэрты. Тры тэнары — Пласіда Дамінга, Хасэ Карэрас, Лучана Паварoці. Рым, 1990 год.
1.35 «Сабака ў ботах». М/ф для дарослых.
2.50 «Гай Юлій Цэзар». Дак. фільм.

### Настальгія

6.00 «Юбілейны канцэрт гурта «Земляне». 2-е аддзяленне.*
7.20, 13.15, 19.40 Маст. фільм «Д'Артаньян і тры мушкецёры».***
8.45, 9.40, 11.40, 14.45, 15.40, 17.00, 19.25, 20.40, 23.10, 3.40, 5.00, 5.40 Музычная настальгія.*
9.00, 15.00, 3.00 «Мінулы час».*
10.00, 4.00 «Народжаны ў СССР».*
11.05 «Песня-82». 2-я частка.*
12.00, 18.00 «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1959. 2009 год.***
16.00 «Колба часу».***
17.30 Серыял «33 квадратныя метры. Дачныя гісторыі».***
19.15 Дак. фільм «Навіны дня. Хроніка нашых дзён».*
21.00 «Быў час». 2009 год.***
22.00 Маст. фільм «Камічны палюбоўнік, або Любоўныя задумы сэра Джона Фальстафа».***
23.40, 5.30 «Сядзі і глядзі». Музычна-парадыйная праграма.***
23.55 «Спяем, сябры!» з Таццянай Візбар. 2007 год.*
0.55 Маст. фільм «Прыгажун-мужчына».***

### EuroSport 1

4.00, 8.00 Тэніс. Турнір АТР.
5.30, 13.00 Веласпорт. Нацыянальны чэмпіянат.
7.00, 10.00 Веласпорт. «Тур дэ Франс»-2016.
9.30 Футбол. Чэмпіянат MLS.
11.00 Веласпорт. Класіка.
12.00 Веласпорт. «Джыра-д'Італія».
14.15 Веласпорт. «Тур дэ Франс». Прэзентацыя каманд.
15.45, 19.45 Веласпорт. «Тур дэ Франс»-экстра.
16.15, 2.30 Веласпорт. «Тур дэ Франс».
20.15, 1.30 Тэніс. Турнір АТР. Фінал.
22.00, 0.35 Веласпорт. «Тур дэ Франс» з Грэгам Леманам.
23.00 Конны спорт. Global Champions Tour.

### КИНОКОМЕДИЯ Кінакамедыя

0.35 Меладрама «Бум-2».***
2.30 Камедыя «Помню — не помню».*
3.50 Меладрама «Лос-Анджэлеская гісторыя».***
5.35 Прыгоды «Востраў шанцавання».*
7.15 Меладрама «10 дзён, каб закахацца».***
9.00 Камедыя «Ну ты і прыдурак!»***
10.45 Прыгоды «Вікі».***
12.20 Камедыя «Місія: неадэкватная».***
14.00 Камедыя «Дзеці сексу не перашкода».***
16.00 Камедыя «Што вытвараюць мужчыны!-2».***
17.35 Камедыя «Больш, чым жыццё».0



19.15 Камедыя «Беласнежка: помста гномаў».*
21.10 Прыгоды «Факап, або Горш не бывае».***
23.15 Камедыя «Хочаш ці не?»***

### ТБ3

6.00 М/ф.
10.05 «Усё па фэн-шую».*
11.05 «Хронікі маскоўскага побыту».***
11.55, 2.35 «Жыццё, па чутках, адно». Серыял.*
15.15 «Баламут». Камедыя.***
16.50 «Жанна, пажані».***
17.50 «Вяселле і развод».***
18.40, 5.35 «10 самых».***
19.15 «Блокбастары».***
20.20 «Ванечка». Драма.*
22.20 «Патрашыцелі». Фантастыка.***
0.25 «Звышнатуральнае». Серыял.***
1.45 «Блокбастары».***

### ТБ1000

6.10, 17.40 Баец.***
8.30 Аднакласнікі.***
10.45 Кіт.***
12.45 Сёстры Магдаліны.***
15.15 Ззянне.***
20.10 Ужо хто б казаў.*
22.15 Усмешка Моны Лізы.*
0.30 Холад у ліпені.***
2.40 Адвакат д'ябла.***
5.05 Як баязлівы Роберт Форд забіў Джэсі Джэймса.***

### ТБ1000 Рускае кіно

6.20 Бармен.***
8.10 Ванечка.***
10.20 Душа шпіёна.***
12.25 Завяшчанне прафесара Доўэля.
14.20 Супердрэнныя.****
15.50 Як я правёў гэтым летам.***
18.20 Выкрутасы.*
20.20 Дзень радыё.***
22.20 Спарта.***
0.10 Слізгаценне.****
2.20 Экспірыенс.***
4.20 Здзіві мяне.***

### National Geographic

6.00 Гульні розуму.*
6.50, 5.35 Навуковыя недарэчнасці.*
7.40 Міжнародны аэрапорт Дубай.*
10.05 Сапраўдны суперкар.*
11.35, 21.45 Гісторыя Бога з Морганам Фрыменам.*
12.25 Прарыў.*
13.15, 15.35, 17.05, 3.15 Мегазаводы.*
17.55, 20.55 Пачатак.*
18.40 Праз 24 гадзіны: сутыкненне з астэроідам.*
19.30 Макан і арол.*
20.10 Навука будучыні.*
22.35 Секунды да катастрофы.***
23.20 Даследчык.****
0.10 Ліхтугі за мяжой.***
0.55 Злавіць кантрабандыста: аэрапорт Кэнэдзі.***
2.30 Дзіўная Другая сусветная.***

### Discovery

8.00 Бітвы робатаў.*
9.00 Бітва з акіянам.*
10.00 Паляўнічыя на склады.***
11.00, 23.00 Як працуюць машыны.*
12.00 Голыя і напалоханыя.***
13.00, 1.00 Аляска: сям'я з лесу.***
14.00, 22.00 Войны за малюска.*
15.00 Будаўнікі караблёў-гігантаў.*
16.00 Кроў і лютасць: грамадзянская вайна ў ЗША.*
17.00 Скарб Купера.*
18.00, 7.10 Геній аўтадызайну.*
19.00, 0.00 Адраджэнне металалому.*
20.00 Вулічныя гонкі.***
21.00 Смяротны ўлоў.***
2.00 Востраў.***
4.40 Браты Дызель.***

## Калейдаскоп

# «Ці не замахнуцца на Уільяма нашага Шэкспіра?»

Самыя «кінагенічныя» класікі сусветнай літаратуры

У кінематографе, як і ў мастацтве наогул, хтосьці шукае новыя тэмы і герояў, а хтосьці здзіўляе новым поглядам і прачытаннем даўно знаёмага сюжэта. А ці ведаеце вы, якія літаратурныя творы найчасцей выбіраюць для экранізацыі рэжысёры з розных краін?

**Уільям Шэкспір**



Гамлет — Інакенцій Смактуноўскі. 1964 г.

Толькі ягоную класічную трагедыю «Гамлет» адаптавалі для кіно амаль 100 разоў, а ў ролі прынца Дацкага вызначыліся ў свой час Лоўрэнс Аліўе, Інакенцій Смактуноўскі, Мэл Гібсан і нават... Сара Бернар (легендарная тэатральная актрыса сыграла ў адной з першых кінапастановак пад назвай «Дуэль Гамлета»). Наогул жа, колькасць экранізацый твораў брытанскага драматурга набліжаецца да 900, і яшчэ каля дзесятка кіна- і тэлефільмаў анансуюцца да выпуску ў 2017—2019 гадах. Свае прачытанні Шэкспіра прапаноўвалі гледачам рэжысёры ЗША, Індыі, Швецыі, Бразіліі, Фінляндыі, Кітая і многіх іншых краін.

**Антон Чэхаў**



«Мой ласкавы і пяшчотны звер» — адна з найлепшых у свеце экранізацый Чэхава.

На другой прыступцы рэйтынгу размяшчаецца знакаміты «лекар чалавечай душы», рускі пісьменнік і драматург Антон Паўлавіч Чэхаў. Паводле звестак найбуйнейшай у свеце базы даных пра кінематограф IMdb, чэхаўскія творы на дадзены момант былі перанесены на экран амаль 380 разоў.

**Чарльз Дыкенс**



Аскараносны мюзікл «Олівер».

На рахунку брытанскага класіка — звыш 300 тэлевізійных і кінапастановак, прычым у апошнія 10 гадоў ягоныя творы ўпадабала менавіта тэлебачанне як невычэрпную крыніцу драматычных серыялаў. Між іншым, першая кінаверсія ягонага «Олівера Твіста» была знята ажно ў 1897 годзе.

**Аляксандр Дзюма-старэйшы**

Раман Дзюма-бацькі «Тры мушкецёры», напісаны ў далёкім 1844 годзе, прайшоў выпрабаванне часам і прасторай: упершыню нямы фільм «Тры мушкецёры» паставілі кінематаграфісты Вялікабрытаніі ў 1898-м, а ў спісе свежых экранізацый аднайменны паўднёвакарэйскі серыял датуецца 2014-м. Толькі французы пераносілі прыгоды сяброў-мушкецёраў на экран, у тым ліку ў выглядзе мультфільмаў, мюзіклаў і тэлесерыялаў, амаль 30 разоў! Не меншую славу ў кіно здабыў і раман «Граф Монтэ-Крыста», які перажыў звыш трох дзясяткаў экранізацый. Агульная ж колькасць кінаадаптацый твораў Дзюма-старэйшага перавысіла 230.

Акрамя таго, у топ-10 самых экранізаваных класікаў сусветнай літаратуры ўваходзяць Эдгар Алан По, Роберт Льюіс Стывенсан, Артур Конан Дойл, Ханс Крысціян Андэрсен, браты Грым і О. Генры ■

# АДУКАЦЫЙНЫЯ ПАСЛУГІ — НА ЭКСПАРТ



## Вопыт Гродзенскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта

Адной з адметных рысаў сусветнай эканомікі апошніх дзесяцігоддзяў з'яўляецца дынамічны рост сферы паслуг. Відавочна, што гэтая тэндэнцыя — заканамерны вынік пераходу соцыуму да постіндустрыяльнай стадыі. Ва ўмовах глабалізацыі, магутнай канкурэнцыі на міжнародных рынках тавараў і паслуг нацыянальная эканоміка таксама не можа ўстойліва расці без развіцця шэрагу кірункаў знешнеэканамічнай дзейнасці, адным з якіх з'яўляецца экспарт адукацыйных паслуг. Значнасць гэтага напрамку абумоўлена шматвектарнасцю вынікаў, якія дасягаюцца, — ад эканамічнай выгады да рэалізацыі геапалітычных інтарэсаў і ператварэння нацыянальных універсітэтаў (у першую чаргу за кошт павышэння якасці навучання) у міжнародныя навукова-адукацыйныя комплексы.

З сярэдзіны XX ст. вядучыя сусветныя дзяржавы пачалі разглядаць міжнародныя адукацыйныя праграмы і міжнародныя абмены як частку сваёй знешняй палітыкі, паставіўшы іх па важнасці ў адзін шэраг з ваеннай і эканамічнай дапамогай іншым краінам.

Варта адзначыць, што Праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2016—2020 гады таксама прадугледжвае рэалізацыю комплексу мер па павышэнні канкурэнтных пераваг нацыянальнай сістэмы вышэйшай адукацыі ў міжнароднай адукацыйнай прасторы. Акрамя таго, дзяржаўная праграма «Адукацыя і маладзёжная палітыка» на 2016—2020 гады, зацверджаная пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 28 сакавіка 2016 года №250, сярод найважнейшых кірункаў развіцця айчыннай вышэйшай школы вылучае павышэнне яе міжнароднага прэстыжу, экспарт адукацыйных паслуг і міжнароднае супрацоўніцтва, якія заклікаены садзейнічаць забеспячэнню якасці падрыхтоўкі спецыялістаў, развіццю сістэмы адукацыі ў нацыянальных інтарэсах з улікам сусветных тэндэнцый і перадавога вопыту, умацаванню міжнароднага супрацоўніцтва з адукацыйнымі і навуковымі ўстановамі замежных дзяржаў.

Сёння можна гаварыць пра тое, што Беларусь мае пэўную нішу на рынку міжнародных адукацыйных паслуг. Пры гэтым, безумоўна, дамінуе пасіўны экспарт, які прадугледжвае падрыхтоўку замежных спецыялістаў у айчынных установах вышэйшай адукацыі. Актыўны экспарт узнік паралельна нядаўна і звязаны з замежнай экспансіяй ВНУ, стварэннем у іншых краінах прадстаўніцтваў і філіялаў, прэтэндуючы ў перспектыве на сістэму работы па мадэлі транснацыянальных карпарацый. У выпадку апасродкаванага ўзаемадзеяння экспарцёра і імпарцёра адукацыйных паслуг складваецца дыстанцыйная мадэль экспарту. Для забеспячэння больш шырокага ўдзелу ў працэсах інтэрнацыяналізацыі вышэйшай адукацыі, развіцця міжнароднай дзейнасці, павелічэння акадэмічнай, студэнцкай мабільнасці і нарошчвання экспарту адукацыйных паслуг вельмі важным уяўляецца пашырэнне падрыхтоўкі студэнтаў па замежных мовах у нямоўных ВНУ.

Пытанне валодання замежнымі мовамі ў асяроддзі выкладчыцкага складу ВНУ з'яўляецца праблемай, якая павінна быць вырашана ў наступныя некалькі гадоў, заявіў на сустрэчы з педагагічнай грамадскасцю Смалявіцкага раёна 6 мая міністр адукацыі Беларусі Ігар Карпенка. Падчас сустрэчы з педагогамі ён заўважыў, што калі ў найбліжэйшы час беларускія ВНУ не змогуць прапанаваць выкладанне на англійскай мове, то краіна страціць экспарт паслуг.

Пэўныя напрацоўкі ў галіне навучання замежных студэнтаў на англійскай мове, якія могуць быць выкарыстаны ў іншых навучальных установах краіны, ёсць у Гродзенскім дзяржаўным медыцынскім універсітэце. Сёння ў ГрДМУ навучаецца больш за семсот замежных студэнтаў з 33 краін. Іх падрыхтоўкай тут займаюцца больш за 20 гадоў, у тым ліку больш за 15 гадоў увесь курс навучання вядзецца на англійскай мове. З кожным годам усё больш педагогаў могуць весці заняткі на замежнай мове. Якасць падрыхтоўкі дастаткова высокая, пра што сведчыць і конкурс сярод небеларускіх студэнтаў (каля двух чалавек на месца), і іх агульны колькасны рост. Пры гэтым колькасць англамоўных студэнтаў ва ўніверсітэце за апошнія пяць гадоў павялічылася больш чым у чатыры разы. Між тым адным з важных крокаў у рабоце з англамоўнымі замежнымі грамадзянамі з'яўляецца іх якасны адбор пры паступленні. Уступныя іспыты праводзяцца ў выглядзе гутаркі па мове з уключэннем пытанняў па біялогіі і хіміі і дазваляюць выбраць найбольш адораных абітурыентаў.

Для ажыццяўлення навучання на англійскай мове была праведзена вялікая папярэдняя работа па падрыхтоўцы выкладчыкаў. Кожная кафедра, якая займаецца падрыхтоўкай студэнтаў першага і другога курсаў, а затым трэцяга курса і, урэшце, па ўсіх клінічных дысцыплінах старэйшых курсаў, вылучыла па два і больш выкладчыкаў, якія ў дастатковай ступені валодалі англійскай мовай, каб перадаваць свае прафесійныя веды, уменні і навыкі на ёй. Гэтыя спецыялісты на працягу двух гадоў праходзілі падрыхтоўку па англійскай мове для медыцынскіх мэт у спецыяльна створаных па профілях дысцыплін групах прафесарска-выкладчыцкага складу на кафедры замежных моў. Пры гэтым адной з галоўных задач была падрыхтоўка метадычнай базы і матэрыялаў для навучання студэнтаў на англійскай мове.

Сёння ў сувязі са значным ростам колькасці англамоўных грамадзян працягваецца актыўная работа па падрыхтоўцы кадраў для працы з замежнымі студэнтамі, якія навучаюцца на англійскай мове, і павышэнні ўзроўню іх кваліфікацыі. Так, кафедра замежных моў працягвае праводзіць заняткі па навучанні англійскай мове для спецыяльных мэт або яе ўдасканаленні па профілях дысцыплін для выкладчыкаў. Канчатковы этап такой формы навучання — атэстацыя прафесарска-выкладчыцкага складу па вызначэнні ўзроўню валодання мовай на атрыманне допуску да правядзення вучэбных заняткаў і лекцый у групах студэнтаў факультэта замежных навучэнцаў, якія атрымліваюць адукацыю на англійскай мове, распрацаваная на кафедры замежных моў. Вызначэнне ўзроўняў валодання англійскай мовай ажыццяўляецца ў адпаведнасці з Агульнаеўрапейскай сістэмай ацэнкі ведання замежных моў, распрацаванай Саветам Еўропы, адаптаванай для Гродзенскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта. З 2009 года паспяхова вытрымалі атэстацыю і маюць права праводзіць практычныя заняткі і чытаць лекцыі на англійскай мове каля 200 выкладчыкаў ГрДМУ. Аступененасць сярод спецыялістаў, якія вядуць заняткі на англійскай мове, вышэйшая за агульнаўніверсітэцкую аступененасць прафесарска-выкладчыцкага складу — 60%.



Асаблівая ўвага ўдзяляецца забяспечанасці кнігамі на факультэце замежных навучэнцаў. За перыяд з 2003 па 2016 год было распрацавана і выдадзена 124 навучальныя дапаможнікі на англійскай мове, у тым ліку 10 з грыфам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. 93 дапаможнікі выдадзены за апошнія шэсць гадоў. Для забеспячэння выкладання вучэбных дысцыплін на англійскай мове за 2012—2015 гг. было набыта больш як 100 назваў падручнікаў. У 2015—2016 гг. было закуплена 97 найменняў вучэбных выданняў (1016 асобнікаў). У асноўным гэта кнігі найбуйнейшых сусветных выдавецтваў Elsevier, Blackwell Publishing, McGraw-Hill education і інш. Два разы на год абнаўляюцца банкі даных па забяспечанасці кнігамі. Высокая якасць бібліятэчна-інфармацыйнага забеспячэння замежных студэнтаў з англійскай мовай навучання спрыяе павышэнню іміджу і бібліятэкі, і ўніверсітэта ў цэлым.

Значна палепшылі якасць вучэбна-метадычнай забяспечанасці стварэнне і ўкараненне электронных вучэбна-метадычных комплексаў (ЭВМК) у сістэме MOODLE. У 2011—2016 гг. на факультэце замежных навучэнцаў створаны і зацверджаны ў Інстытуце прыкладных інфармацыйных сістэм 73 электронныя комплексы па спецыяльнасці «Лячэбная справа» на англійскай мове і 99 — на рускай (з іх 35 асобна для студэнтаў факультэта замежных навучэнцаў і 64 — для лячэбнага факультэта), якімі карыстаюцца студэнты з іншых краін. Летась цалкам завершана работа па іх стварэнні на англійскай мове па ўсіх дысцыплінах, што выкладаюцца.

Вялікая роля і электроннай бібліятэкі ГрДМУ, якая штогод забяспечвае аддалены доступ да замежных поўнатэкставых і рэфератыўных электронных рэсурсаў па профілі ўніверсітэта. Замежныя англамоўныя студэнты могуць карыстацца лічбавымі калекцыямі медыцынскіх кніг і часопісаў выдавецтваў Springer Link, Oxford university press, The New England Journal of Medicine, The British Medical Journal, базай даных SCOPUS ад кампаніі Elsevier, платформай EBSCO. Функцыянуе і абанемент замежнай літаратуры, асноўны кантынгент якога — студэнты, якія навучаюцца на англійскай мове. Аказанне ўсіх бібліятэчных паслуг ажыццяўляецца таксама на англійскай мове.



Відавочна, што росту экспарту адукацыйных паслуг садзейнічае даволі высокі міжнародны рэйтынг універсітэта. Так, паводле рэйтынгу Webometrics, апублікаванага ў пачатку жніўня 2016-га, ГрДМУ займае 1-е месца сярод медыцынскіх універсітэтаў Беларусі і 4-е — сярод медыцынскіх універсітэтаў краін СНД. Акрамя таго, высокакваліфікаваны кадравы склад, сучасныя адукацыйныя тэхналогіі і самая моцная практычная падрыхтоўка медыцынскіх кадраў дазволілі калектыву ўстановы не толькі пацвердзіць высокае званне лаўрэата Прэміі Урада Рэспублікі Беларусь за дасягненні ў галіне якасці, але і задумацца аб адкрыцці ў найбліжэйшай перспектыве філіяла падрыхтоўчага аддзялення ГрДМУ за мяжой. Падаецца, што гэты крок не толькі станоўча адаб'ецца на экспарце адукацыйных паслуг, але і будзе садзейнічаць павышэнню прэстыжнасці айчыннай медыцынскай адукацыі ў свеце, што станоўча адаб'ецца на іміджы краіны ў цэлым.

Стратэгічнай жа мэтай дзяржаўнай палітыкі ў галіне экспарту адукацыйных паслуг, на нашу думку, павінна стаць забеспячэнне высокай якасці падрыхтоўкі і канкурэнтаздольнасці выпускнікоў айчынных ВНУ на сусветным рынку адукацыі і працы.

**РЭСПУБЛІКА БЕЛАРУСЬ, Г. ГРОДНА, 230009, ВУЛ. ГОРКАГА, 80**
**ТЭЛЕФОН +375 (152) 43-26-61,**
**ФАКС +375 (152) 43-53-41**
**WWW.GRSMU.BY**

Матэрыялы паласы і фотаздымкі прадастаўлены ўніверсітэтам.
УНП 500032863

# ОАО «КРУПСКИЙ ПЛОДООВОЩНОЙ ЗАВОД»

**извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона**

**Лот №1 (таблица 1)**

**Комплекс зданий и оборудования для производства плодоовощной продукции (одним лотом)** в составе: производственный корпус (613/С-13477) 201,6 кв. м; гараж на 4 бокса (613/С-13484) 119,5 кв. м; гараж на 2 бокса (613/С-13483) 46,2 кв. м; здание цеха для брожения вина (613/С-13526) 157,7 кв. м; здание цеха по переработке яблок (613/С-13528) 249,2 кв. м; здание цеха безалкогольных напитков (613/С-13527) 416,2 кв. м; здание кисельного и горчичного цеха (613/С-13481) 813,6 кв. м; здание мастерских (613/С-13478) 169,8 кв. м; здание погреба (613/С-13482) 47,4 кв. м; здание котельной (613/С-13485) 199 кв. м; здание спиртохранилища (613/С-13479) 104,4 кв. м; здание проходной (613/С-13480) 54,1 кв. м; здание склада материальных ценностей (613/С-10557) 250 кв. м; здание арочника №1 (613/С-10558) 490,0 кв. м; здание арочника №2 (613/С-10559) 490,0 кв. м; водонапорная башня (613/С-13560); артезианская скважина (613/С-13559); оборудование согласно перечню, размещенному на сайте https://sites.google.com/site/pcjuristcom/home

Земельный участок №623050100001002242 предоставлен для обслуживания зданий и сооружений производственный базы на праве аренды площадью 1,85 га

| | |
|---|---|
| **Дата и место проведения** | 07 июля 2017 года в 14.00 по адресу: г. Минск, пр-т Независимости, 11, конференц-комната №609 |
| **Начальная цена с НДС 20%** | 533 713,28 белорусских рублей |
| **Задаток** | 53 371,33 белорусских рублей |
| **Шаг аукциона** | 5% |

*Торги в отношении имущества, указанного в таблице №1, проводятся повторно второй раз. Публикация об аукционе ранее публиковалась 17.05.2017 г. в газете «Звязда». Цена на предмет торгов снижена на 5%.*
*Окончание приема заявлений в 18.00 06.07.2017*

**(таблица 2)**

| № п/п лота | Наименование | Начальная цена с НДС, бел. руб. |
|---|---|---|
| **Лот №1** | Прицеп-цистерна пищевая 0,9 т | 225,84 |

| | |
|---|---|
| **Шаг аукциона** | 5% |
| **Дата и место проведения** | 07 июля 2017 года в 14.00 по адресу: г. Крупки, ул. Московская, д. 1 |

*Торги в отношении имущества, указанного в таблице №2, проводятся повторно пятый раз. Публикация об аукционе ранее публиковалась 17.05.2017 г. в газете «Звязда». Цена на предмет торгов снижена на 80%.*
*Окончание приема заявлений в 18.00 06.07.2017*

| | |
|---|---|
| **Информация о продавце** | ОАО «Крупский плодоовощной завод», Минская область, г. Крупки, ул. Московская, д. 1 (ликвидатор – ООО «Партнер-Консультант», г. Минск, ул. Мележа, д. 1, оф. 1122) |

**Место нахождения предмета торгов:**
**Минская обл., г. Крупки, ул. Московская, д. 1**

Все желающие могут предварительно ознакомиться с объектом торгов.
Контактное лицо для осмотра объекта торгов: Андрей, +37544 552 42 92

**Условия для участия в торгах**

1. До подачи заявления внести задаток на р/с 3012221557014 в ЗАО «Альфа-Банк», код банка 270, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: Задаток для участия в торгах.
2. Подать заявление на участие в торгах, документ, подтверждающий внесение суммы задатка с отметкой банка. К заявлению на участие в торгах прилагаются документы согласно п. 12 Положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 №16. Образец заявления и перечень документов можно посмотреть на сайте https://sites.google.com/site/pcjuristcom/informacia-o-torgah
3. Лица, желающие принять участие в аукционе, и выполнившие все требования, допускаются к участию в аукционе посредством выдачи билета участника аукциона, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов. Договор купли-продажи заключается между продавцом и победителем аукциона (приравненным к нему лицом) в белорусских рублях в течение 5 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть проведена в полном объеме не позднее 10 рабочих дней с даты подписания договора купли-продажи. Также победителем подлежат возмещению затраты по организации и проведению торгов в размере 5% от начальной стоимости объекта торгов, а также затраты по размещению публикации (согласно выставленному счету).
4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5%, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона

# ОБЪЯВЛЕНИЕ

о торгах

Отдел принудительного исполнения Оршанского района и г. Орши объявляет о проведении торгов по продаже имущества, принадлежащего ООО «СоМеТ».

Номер лота, вид выставляемого на торги имущества: Лот №1, объект: экскаватор-погрузчик.

Наименование, начальная цена, место нахождения: погрузчик-экскаватор Volvo BL71B, 2014 года выпуска, заводской номер VCEBL71BA0148116, рез. знак ВВ-2 8149 в количестве 1 шт., начальная цена – 81238,30 рублей, местонахождение – г. Орша, ул. Марата, 214.

Имеющиеся обременения в отношении имущества – без обременений.

Место, дата и время проведения торгов: г. Орша, ул. А. Островского, 36, каб.1; 18 июля 2017 г. в 12.00.

Справочная информация: Маханькова Анастасия Александровна, главный специалист, тел.: 8 (0216) 543202, 8 (033) 6161412, отдел принудительного исполнения Оршанского района и г. Орши, адрес: ул. А. Островского, 36, г. Орша, адрес электронной почты opi_orsha@tut.by

Задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (лота) должен быть зачислен в срок до 17 июля 2017 г. на депозитный счет отдела принудительного исполнения Оршанского района и г. Орши №3642903000794, УНН 300002505 Оршанского отделения ОАО «АСБ Беларусбанк», код 647 (с 4 июля 2017 г. – №BY22AKBB36429030007942200000, филиал №215 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Орша, код AKBBBY21215).

Величина первого шага составляет 5 процентов начальной стоимости выставленного на торги имущества (лота).

В соответствии со статьей 97 Закона Республики Беларусь «Об исполнительном производстве» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги (покупателем)

# ЛОГОЙСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

**сообщает о проведении 26 июля 2017 года открытого аукциона по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов**

| **№ лота** | 1 | 2 | 3 |
|---|---|---|---|
| **Адрес земельного участка, кадастровый номер** | д. Августово, ул. Зеленая, д.15 623284600201000302 | д. Силичи, ул. Березовая, д. 6 623284605401000332 | д. Силичи, ул. Березовая, д. 8 623284605401000331 |
| **Площадь земельного участка, га** | 0,1167 га | 0,1476 | 0,1290 |
| **Инженерная инфраструктура** | газоснабжение, электроснабжение | газоснабжение | газоснабжение |
| **Начальная цена, руб.** | 3 300,00 | 3 700,00 | 3 700,00 |
| **Расходы по подготовке землеустроительной документации руб.** | 1 849,57 + реклама | 1 942,46 + реклама | 1 872,22 + реклама |
| **Задаток (рублей)** | 330,00 | 370,00 | 370,00 |

Земельный участок в д. Августово, ул. Зеленая, 15 имеет ограничения в использовании площадью 0,0018 га в связи с расположением в охранных зонах сетей и сооружений водоснабжения.
Задаток в размере 10% от начальной цены земельного участка перечисляется на р/с 3600619101103 в ЦБУ №611 филиала №500 Минское управление ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Логойск, ул. Пролетарская, 1, код 795, УНП 600537220, код 04901. Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы, связанные с подготовкой землеустроительной документации. Все участники могут ознакомиться с земельными участками и документацией на них. Иные обязанности победителя торгов и порядок проведения аукциона оговорены в условиях его проведения.

**Аукцион состоится 26 июля 2017 года в 10.00 по адресу:**
**г. Логойск, ул. Тимчука, д. 6.**

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по рабочим дням с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: г. Логойск, ул. Тимчука, 6.
**Последний день приема заявлений 20 июля 2017 года до 17.00**.
**Контактные телефоны: (801774) 28473, (8029) 177 95 11.**

# КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 апреля 2017 года

«Приорбанк» Открытое акционерное общество

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | На 1 апреля 2017 | На 1 января 2017 |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | АКТИВЫ | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 5.1 | 150 932 | 131 787 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | 5.2 | 218 | 297 |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 5.3 | 195 177 | 224 436 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 5.4 | 285 158 | 476 543 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 5.5 | 332 510 | 173 206 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 5.6 | 1 684 807 | 1 735 245 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | 5.12 | 245 | 149 |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | 5.7 | 1 119 | 1 168 |
| 10 | Инвестиции в зависимые юридические лица | | | - | - |
| 11 | Инвестиции в совместно контролируемые юридические лица | | | - | - |
| 12 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 5.8 | 218 066 | 183 466 |
| 13 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | 5.9 | 7 437 | 8 806 |
| 14 | Деловая репутация | | | - | - |
| 15 | Отложенные налоговые активы | 1111 | 5.10 | - | - |
| 16 | Прочие активы | 1112 | 5.11 | 123 146 | 122 589 |
| 17 | ИТОГО активы | 11 | | **2 998 815** | **3 057 692** |
| 18 | ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | | | | |
| 19 | Средства Национального банка | 1201 | 5.13 | - | - |
| 20 | Средства банков | 1202 | 5.14 | 351 440 | 451 608 |
| 21 | Средства клиентов | 1203 | 5.15 | 1 816 340 | 1 861 553 |
| 22 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | 5.16 | 3 646 | 3 782 |
| 23 | Производные финансовые обязательства | 1205 | 5.12 | 180 | 51 |
| 24 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | | - | - |
| 25 | Прочие обязательства | 1207 | 5.11 | 196 068 | 184 901 |
| 26 | ВСЕГО обязательства | 120 | | **2 367 674** | **2 501 895** |
| 27 | СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ | | | | |
| 28 | Уставный фонд | 1211 | 5.18 | 86 148 | 86 148 |
| 29 | Эмиссионный доход | 1212 | 5.18 | - | - |
| 30 | Резервный фонд | 1213 | 5.18 | 130 813 | 126 741 |
| 31 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | 5.18 | 84 763 | 84 376 |
| 32 | Накопленная прибыль | 1215 | 5.18 | 315 211 | 246 702 |
| 33 | Всего собственный капитал, принадлежащий головной организации – банку | | 5.18 | 616 935 | 543 967 |
| 34 | Доля неконтролирующих акционеров | | 5.18 | 14 206 | 11 830 |
| 35 | Всего собственный капитал | 121 | 5.18 | 631 141 | 555 797 |
| 36 | Итого обязательства и собственный капитал | 12 | | **2 998 815** | **3 057 692** |
| 37 | Капитал дочерних юридических лиц | | | - | - |

# КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ на 1 апреля 2017 года

«Приорбанк» Открытое акционерное общество

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | На 1 апреля 2017 | На 1 апреля 2016 |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 75 191 | 94 125 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 13 267 | 23 736 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 6.1 | 61 924 | 70 389 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 35 355 | 33 983 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 8 728 | 8 020 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 6.2 | 26 627 | 25 963 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | 6.3 | 27 | 501 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 6.4 | (185) | - |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 6.5 | 11 966 | 1 214 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными инструментами | 206 | 6.6 | 288 | 1 116 |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 6.7 | (19 666) | 22 729 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 6.8 | 38 160 | 18 518 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 6.9 | 78 156 | 55 520 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | | 2 176 | 2 919 |
| 15 | Прибыль до налогообложения | 211 | | 78 141 | 36 533 |
| 16 | Налог на прибыль | 212 | | 10 351 | 7 672 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ | 2 | | **67 790** | **28 861** |
| 18 | Доля в прибыле (убытке) зависимых юридических лиц | | | - | - |
| 19 | Доля в прибыле (убытке) совместно контролируемых юридических лиц | | | - | - |
| 20 | ИТОГО ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | | | **67 790** | **28 861** |
| 21 | Доля в прибыли (убытке), принадлежащая головной организации – банку | | | 65 414 | 30 457 |
| 22 | Доля неконтролирующих акционеров в прибыли (убытке) | | | 2 376 | (1 596) |

Временно и.о.
Председателя Правления — С.И. Шишов

Главный бухгалтер — В.В. Манцивода

Дата подписания: 22 мая 2017 г.

Финансовая отчетность размещена на интернет-странице банка:
**https://www.priorbank.by/konsolidirovannye-kvartal-nye-otcety**

Лицензия на осуществление банковской деятельности НБ РБ № 12 от 06.05.2013 года. УНП 100220190.

# Извещение об открытом аукционе по продаже земельных участков в собственность в г. Гродно (ул. Малаховичская, микрорайон «Зарица-5») 25 июля 2017 года

| № лота | Наименование объекта | Местонахождение объекта | Площадь земельного участка (га) | Кадастровый номер | Стоимость затрат на изготовление документации, руб. | Начальная цена продажи, руб. | Сумма задатка, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Земельный участок * | ул. Малаховичская, в районе здания 30А | 0,0952 | 440100000001009983 | 2 934,96 | 16 964,35 | 3 200 |
| 2 | Земельный участок У-112* | микрорайон «Зарица-5» | 0,0976 | 440100000003004630 | - | 13 005,45 | 2 600 |
| 3 | Земельный участок У-284* | микрорайон «Зарица-5» | 0,1042 | 440100000003004787 | - | 11 875,74 | 2 300 |

* Инженерные коммуникации на участке отсутствуют.
Земельные участки предоставляются в частную собственность для строительства одноквартирного жилого дома.
Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости».
Условия, предусмотренные в решении о формировании земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона:
внесение платы за земельные участки; возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения; обращение за государственной регистрацией прав на земельный участок в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся; получение победителями аукциона в установленном порядке технической документации и разрешения на строительство жилого дома; занятие земельных участков (осуществление строительно-монтажных работ) осуществить не позднее одного года со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство одноквартирного жилого дома, возместить затраты в соответствии с решением Гродненского горисполкома от 08.02.2016 №49 «О некоторых вопросах возмещения затрат на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры».

**Аукцион состоится 25 июля 2017 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1 (актовый зал).**

Для участия в аукционе необходимо: внести задаток не позднее **19 июля 2017 года** в размере, указанном в графе 8, перечисляемый на расчетный счет BY24 AKBB 3012 0000 4181 0400 0000 в филиале №400 ГОУ ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY21400, УНП 590727594 получатель – КУП по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», задаток вносится в белорусских рублях в сумме согласно настоящему извещению;
представить в КУП по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости» следующие документы;
заявление на участие в аукционе установленной формы;
документ, подтверждающий внесение суммы задатка;
подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, включающее обязательство по уплате в соответствии с законодательством штрафных санкций и иные требования;
дополнительно представляются:
гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.
При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.
**Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, каб. 57 с 26 июня по 19 июля 2017 года включительно в рабочие дни с 08.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00.**
Торги в отношении каждого земельного участка проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов по каждому предмету аукциона признается участник, предложивший наиболее высокую цену.
Победитель торгов либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на приобретение земельного участка, как единственный, подавший заявление на участие в аукционе, в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся обязан:
внести плату за земельный участок; возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись; выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона.
После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, Гродненский горисполком выдает победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона выписку из решения об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома, а также один экземпляр протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся.
Оплата стоимости предметов аукциона осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли.
При невыполнении требований об обращении за государственной регистрацией прав на земельный участок в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признании аукциона продажи несостоявшимся, решение Гродненского горисполкома о предоставлении земельного участка утрачивает силу.
Осмотр земельного участка на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

**Контактные телефоны:**
**+ 375 (152) 72 05 46, 72 05 37, официальный сайт организатора торгов www.grodno.gov.by**

■ З людзьмі і сам-насам

# «СА «ЗВЯЗДОЙ»... Ад дзядоў і бацькоў — да нас, сыноў і ўнукаў»

**У адной з беларускіх газет была некалі рубрыка «Наш этаж». Інтрыгуючая назва... І прыкладна такі ж змест, бо ў ёй журналісты пісалі пра жыццё рэдакцыі, пра... сябе: анансавалі пэўныя праекты, знаёмілі чытачоў з новымі кадрамі, адказалі на асобныя лісты і пытанні.**

**Чаму праз газету? Як той казаў, чытайце і ўсё зразумееце.**

*«Звязду»,* — паведамляе **спадар С. з Міншчыны,** — *я чытаю вельмі даўно, можа, з пачатку сямідзясятых. Нават не пісаў вам, але камп'ютарам я не валодаю, а вы, мусіць, не чытаеце лісты ад рукі* (цікава, адкуль бяруцца такія думкі? — **Аўт.**). *А таму просьбы ў мяне, можна сказаць, ранейшыя. На старонкі газеты вярнулася рубрыка «Песню бярыце з сабою». Калі ласка, надрукуйце там словы Гімна Расійскай Федэрацыі, пералік усіх яе дзяржаўных свят».*

Здавалася б, нічога складанага: можна знайсці ў інтэрнэце згаданую інфармацыю і даслаць яе шаноўнаму чытачу. Але... куды, калі ў канцы ліста кароткая прыпіска: адрас на канверце... несапраўдны, прозвішча-імя — таксама.

А ў выніку, можна сказаць, «канфлікт», прычым на роўным месцы: чытач незадаволены газетай, бо яму не адказалі, супрацоўнікі газеты — ну вядома ж — незадаволены сабой...

Амаль тыя ж «нажніцы» і з лістом са Жлобіна. **Спадарыня Е. П.** (прозвішча не называем з этычных меркаванняў) паведамляе, што «Звязду» выпісвае 25 гадоў, што столькі ж — дасылае карткі на розыгрыш прызоў, але не выйграе ніколі і нічога, нават па драбязе. *«Гэта проста нерэальна!!!»* — лічыць жанчына.

І зразумець яе зусім няцяжка...

Як, дарэчы, і яе зямлячку, Соф'ю Кусянкову з Рагачоўшчыны. Яна таксама дзесяцігоддзямі выпісвае «Звязду»... Да таго ж у вёсцы стварыла свайго роду клуб аматараў нашай газеты, пастаянна піша вершы на конкурс "Хто каго?", байкі ў рубрыку «...Народ на провадзе!», пастаянна здымае і дасылае ў рэдакцыю фота...

Дык вось: карткі на розыгрыш прызоў яна адпраўляе таксама... Хоць і марна (прынамсі, пакуль), бо на выйгрыш ёй таксама ні разу не пашчасціла.

Крыўдна падпісчыкам, што так бывае, крыўдна і нам, без віны вінаватым супрацоўнікам рэдакцыі. Але ж прызы ў газеце ніколі не размяркоўваліся і не размяркоўваюцца, яны (і «Звязда» аб гэтым піша, прычым пастаянна) менавіта *разыгрываюцца згодна з зацверджанымі правіламі*, у прысутнасці тых жа «сведак» — нашых дзелавых партнёраў (паштамт, нашых падпісчыкаў). Тым з іх, хто хоча, напрыклад, паглядзець, як гэта робіцца, ніхто не забараняе ў першыя дні новага квартала патэлефанаваць у рэдакцыю, удакладніць дзень і час розыгрышу, каб прыняць удзел: з «чароўнага» капелюша сваімі рукамі выцягнуць, так бы мовіць, шчаслівыя карткі.

Адзіная просьба тады: папярэдзіць аб сваім прыездзе, каб рэдакцыя заказала пропуск у Дом прэсы, на наш паверх...

Ёсць у лісце са Жлобіна і яшчэ адна прэтэнзія: газета «Звязда» — выданне сур'ёзнае, а друкуецца «на шматках паперы», малым фарматам: *«Калі ласка, вярніце ранейшы выпуск альбо чаргуйце — дзень вялікі фармат, дзень малы».*

Колькі людзей, столькі меркаванняў: амаль адначасова з гэтым лістом у рэдакцыю прыйшоў яшчэ адзін — ад удзельніка Вялікай Айчыннай вайны, адданага падпісчыка і аўтара газеты **спадара Міхася Чарняўскага з к.п. Нарач.** Цытата: *«Вельмі добра, што «Звязда» перастала друкавацца памерам прасціны, яе нязручна было чытаць».*

Няма кансэнсусу на гэты конт і сярод супрацоўнікаў газеты: некаму больш падабаецца стары, вялікі фармат, некаму — новы...

Кіруючыся ўсімі гэтымі пажаданнямі-меркаваннямі, а таксама эканамічнай мэтазгоднасцю (ну куды без яе сягоння?), «Звязда» і выходзіць то вялікім фарматам, то (пераважна) малым.

«Было б што чытаць там», — заўважыць нехта і будзе мець рацыю, бо *«...без сродкаў масавай інфармацыі цяжка ўявіць жыццё. Яны паранейшаму абуджаюць думкі і пачуцці, таму я імкнуся чытаць кожны дзень і заўсёды пачынаю з любімай беларускамоўнай «Звязды»,* — паведамляе **спадар Ілья Антончык з г. Навагрудка.** — *Як пастаянны шматгадовы падпісчык, магу заўважыць, што калектыў рэдакцыі стараецца інфармаваць чытачоў пра найважнейшыя падзеі ў краіне і свеце, асвятляць актуальныя праблемы. Тут можна знайсці адказы на многія пытанні, атрымаць добрыя падказкі і парады...*

*«Звязда»,* — працягвае Ілья Ільіч, — *хутка адзначыць свой стагадовы юбілей.* ***І я проста заклікаю ўсіх беларусаў, жыхароў краіны, падпісацца на гэту газету, чытаць яе, падтрымліваць мову ў сваёй краіне і сваёй душы.*** *Калі гэта адбудзецца, «Звязда» зможа смела глядзець у заўтрашні дзень і адзначаць усё новыя і новыя юбілеі».*

Для таго ж — *каб смела глядзець у заўтрашні дзень...,* на думку **спадара Уладзіміра Голубева з Мінска,** *«Звяздзе» трэба як мага часцей друкаваць лісты чытачоў, іх прапановы і разважанні, бо чалавеку важна быць пачутым, важна выказацца».*

Хто б спрачаўся, мы — не будзем:

*«Серп зведала і жорны*
*Ды малацільны цэп.*
*Таму ніколі чорным*
*Не называла хлеб.*
*Калі іду ў дарогу*
*Ці хоць куды іду,*
*Акрайчык ці асушак*
*У сумку пакладу...»*

Напісала так **спадарыня Валянціна Пчолка з Віцебска.**

Яна ж згадала, як некалі, у 1944-м, на аднаўленне Копыскай МТС прыслалі Міная Карпавіча Крутаўцова і як ён стаў для ўсіх ніби родны бацька.

Першай справай для новага кіраўніка было адкрыццё курсаў трактарыстаў, на якія пайшлі старэйшыя хлопцы і жанчыны. Потым на тэрыторыі МТС запрацаваў млын, з'явіліся (клопатам дырэктара) дзве каровы і два кані. У выніку на кожную сям'ю штомесяц сталі выдзяляць па адным пудзе мукі і штодзень — па літры малака. Да таго ж, каб засеяць гароды, людзям давалі каня, узімку за чатыры кіламетры дзяцей падвозілі ў школу.

*«Падручнікаў там не хапала,* — успамінае спадарыня Валянціна Ягораўна. — *Мы былі кепска апранутыя, напаўгалодныя, але ўсё ж вельмі шчаслівыя, што скончылася вайна, што адступае голад».*

Дык вось адкуль паэтычныя радкі...

Для іх — чытацкіх і вартых увагі — «Звязда», здаецца, заўсёды знаходзіла месца... Хоць і не для ўсіх: крыўдна, калі газеце для публікацыі прапануюць артыкулы, перапісаныя з інтэрнэту альбо з іншых выданняў, ананімныя «трывожныя сігналы», кіпы нядасканалых, мякка кажучы, вершаў з даручэннем прачытаць і выбраць для друку (як быццам ёсць у газеце нейкая літаратурная ўкладка) самыя лепшыя...

Крыўдна яшчэ, што чытачы (прабачце за таўталогію) крыўдзяцца, калі ў іх тэксты ўносяцца праўкі. Але ж тут правіла адно: на старонкі газеты, як дома на стол, нельга ставіць нешта сырое... Значыць, трэба — дзе трохі больш, дзе меней — паправіць, падрыхтаваць матэрыял да друку, патраціць час...

Але ж яго не шкада, дзеля справы, дзеля роднай мовы і роднай газеты, дзеля чытачоў-падпісчыкаў, якія любяць «Звязду» і дзеляцца ці не самым дарагім. **Спадар Леанід Гаўрук з Дзяржынска** даслаў, напрыклад, выразкі з нашай газеты за... 1947 год!

З яго ж канверта кароткі лозунг: «Са «Звяздой»... Ад дзядоў і бацькоў — да нас, сыноў і ўнукаў».

Хараша сказана, гучна... Хай збудзецца! Як і цікае прызнанне **спадара Чарняўскага:**

*Пагоршаў зрок,*
*«Тупее» слых*
*І галава ужо не тая,*
*Але ж выпісваю «Звязду» —*
*чакаю*
*і чытаю.*

Так было, так ёсць і, спадзяёмся, будзе!

**Валянціна ДОЎНАР.**
*dounar@zviazda.by*

■ Векапомнае

## ЛЕТАМ 44-ГА...

### Сталічная моладзь рэканструюе партызанскі парад

**24 чэрвеня з 12.00 да 21.00 у Мінску прадстаўнікі Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі прадставяць шырокамаштабны патрыятычны праект «Летам 44-га...», ініцыятарам якога выступаюць Мінскі гарадскі камітэт ГА «БРСМ» і Мінскі гарадскі выканаўчы камітэт. Месца правядзення — вуліца Камсамольская ад вуліцы Кірава да праспекта Незалежнасці.**




Цэнтральнай падзеяй усяго праекта стане рэканструкцыя партызанскага парада, які прайшоў 16 ліпеня 1944 года на полі былога іпадрома ў Мінску з нагоды вызвалення сталіцы ад нямецкай акупацыі. У рэканструкцыі шэсця партызанскіх атрадаў прымуць удзел 500 хлопцаў. Па задумцы арганізатараў праекта, іх сустракаюць жыхары вызваленай сталіцы, маладыя дзяўчаты ў адзенні 40-х гадоў і з удзячнасцю ўручаюць партызанам букеты палявых кветак. У парадзе таксама возьмуць удзел вершнікі і адзін з сімвалаў партызанскага парада 1944 года — казёл па мянушцы Малыш.

У рамках патрыятычнага праекта на вуліцы Камсамольскай разгорнецца маштабная разнапланавая інтэрактыўная экспазіцыя: квэсты, майстар-класы, палявая кухня, тэматычныя фотазоны, канцэртная і дыджэй-праграма.

Фінальнай кропкай маладзёжнага патрыятычнага праекта «Летам 44-га...» стане сімвалічная акцыя «Мы выбіраем МІР!», у ходзе якой пад выкананне кранальнай кампазіцыі дзіцячым хорам сталічная моладзь выпусціць у неба 73 белыя паветраныя шары, якія сімвалізуюць падзяку маладога пакалення за 73 мірныя гады Беларусі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

## АПОШНІ ПРЫТУЛАК САЛДАТА

**Неўзабаве ў законную сілу ўступіць новая інструкцыя аб парадку правядзення палявых пошукавых работ грамадскімі арганізацыямі.**

**Аб гэтым падчас прэс-канферэнцыі, прымеркаванай да Дня ўсенароднай памяці ахвяр Вялікай Айчыннай вайны, паведаміў начальнік упраўлення па ўвекавечванні памяці абаронцаў Айчыны і ахвяр войнаў Узброеных Сіл палкоўнік Сяргей ВАРАНОВІЧ.**

Акрамя таго, ён расказаў, што за пошукавы перыяд 2016 года 52-м асобным спецыялізаваным пошукавым батальёнам эксгумаваны і перададзены мясцовым выканаўчым і распарадчым органам для далейшага перапахавання астанкі 6232 чалавек, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, а таксама ахвяр Першай сусветнай.

Дарэчы, гэта найбольшая колькасць эксгумаваных астанкаў за адзін пошукавы перыяд за 20-гадовую гісторыю існавання батальёна. Па выніках палявых пошукавых работ, устаноўлены звесткі аб 369 ваеннаслужачых, большасць якіх лічыліся зніклымі без вестак. Летась вайскоўцамі батальёна адпрацавана 100 пошукавых аб'ектаў на тэрыторыі 48 раёнаў усіх абласцей краіны, а таксама ў Мінску і Гродне. Найбольш маштабныя пошукавыя работы атрымалі шырокі грамадскі рэзананс. «Звязда», у сваю чаргу, пісала пра тое, як на тэрыторыі адной з воінскіх часцей у Барысаве былі выяўлены астанкі 4340 загінулых — ахвяр «Шталага 382».

— Сёлета воіны-пошукавікі павінны адпрацаваць на 64 аб'ектах, — зазначыў Сяргей Вароновіч. — Ужо скончаны работы на 26 з іх. Знойдзены астанкі 77 загінулых: 71 чырвонаармейца, пяці ахвяр войнаў, партызана. Ужо ўстаноўлены імёны дзевяці з іх.

Акрамя правядзення палявых пошукавых работ, адным з прыярытэтных кірункаў работы па ўвекавечванні застаецца папаўненне аўтаматызаванага банка даных воінскіх пахаванняў. Сёлета прынята на ўлік 85 воінскіх пахаванняў. Усяго на дзяржаўным уліку іх 7589. Прычым банк даных утрымлівае запісы аб больш чым 2,6 мільёна загінулых на ўзброеных канфліктах у розных гістарычных перыядах.

У межах дзяржаўных праграм у ваенна-мемарыяльнай сферы рэалізоўваецца таксама шэраг міжнародных дагавораў і абавязацельстваў. У прыватнасці, да 2018 года працягнуты пошук ваеннаслужачых, якія зніклі без вестак у перыяд вайны ў Афганістане. У цяперашні момант без вестак зніклымі ў гэтай краіне лічацца 264 беларусы.

**Вераніка КАНЮТА.**
*kanyuta@zviazda.by*

## МЫ НЕ ЗАБЫЛІСЯ

### У Брэсце адзначылі 76-ю гадавіну пачатку Вялікай Айчыннай вайны

**Мерапрыемствы ў памяць аб гістарычных падзеях пачаліся вечарам 21-га чэрвеня на вуліцы Савецкай. Музейныя работнікі, рэканструктары, грамадскія актывісты аднавілі атмасферу апошніх мірных дзён 1941-га года. Экспазіцыі прадстаўлялі інтэр'ер пачатку саракавых, іграла музыка таго часу, па вуліцы прагульваліся пары — мужчыны ў форме вайскоўцаў і дамы ў сукенках нашых прабабуль. Шматлікія наведвальнікі фатаграфаваліся з рэканструктарамі, дзеці аблюбавалі ваенную тэхніку. Малым дазвалялі пасядзець у машынах узору 30-х.**

Шмат гледачоў сабраў парад ваенна-гістарычных аб'яднанняў. Яго ўдзельнікі ў форме стралкоў, артылерыстаў, сапёраў, сувязістаў прайшлі ад КПП ваенна-палявога лагера на вуліцы Зубачова па вуліцы Гогаля да перасячэння з Савецкай. Сёлета на фестываль з'ехалася каля 500 рэканструктараў з 13 краін свету. Расіянін Алег Яфімаў сказаў, што ён удзельнічае ў ваенна-гістарычным клубе ў знак памяці пра дзеда: «Мой дзед Пётр Іванавіч пайшоў на вайну разам з трыма суседзямі па камунальнай кватэры. Вярнуўся ён адзін. Пражыў не доўга, далі знаць франтавыя раненні. Таму наш святы абавязак помніць пра самаахвярныя подзвігі гэтых людзей».

У пяць гадзін раніцы 22-га чэрвеня адбылася рэканструкцыя пачатку абароны Брэсцкай крэпасці. Гледачы, якіх было каля дзесятка тысяч на Кобрынскім умацаванні, убачылі гераічны бой памежнай заставы, бітву за шпіталь, спробы прарыву з крэпасці, атаку Самвела Мацевасяна, якая ўвайшла ў гісторыю. Асабліва кранальным і эмацыйным стаў эпізод здачы ў палон жанчын і дзяцей крэпасці. Драматычная тэатралізаваная дзея дала магчымасць маладому пакаленню акунуцца ў атмасферу вайны.

А перад рэканструкцыяй па даўняй традыцыі прайшоў мітынг-рэквіем з удзелам кіраўніцтва вобласці і горада. Гэтым разам падзеі таго дня на плошчы Цырыманіялаў згадалі яшчэ да світання. На мітынгу выступіў старшыня Брэсцкага гарвыканкама Аляксандр РАГАЧУК. Кіраўнік горада падкрэсліў, што сённяшнія мерапрыемствы сталі сведчаннем памяці, якая жыве ў вяках, і што найлепшым помнікам героям-абаронцам становіцца сёння прыгожы і сучасны Брэст.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*

■ Неасабісты суб'ектыў



# ЧАС ДАРЭМНАГА СЕНАКОСУ

## Наводзячы парадак на ўчастку, мы шукаем саміх сябе?

ПЕРАД навальніцай парыла так, што ад дурманнага водару язміну плыло перад вачыма. Цёмна-сіняя трыбухатая хмара ўжо ляжала чэравам на хмызняку за вёскай і глуха пагрозліва буркатала. Была такая напружаная цішыня, калі нават птушкі перастаюць лётаць і замаўкаюць, якая ідзе на крок наперадзе шалёнага ветру, залевы і водбліскаў маланак... Да непагадзі заставалася самае большае хвілін пятнаццаць, а яшчэ некалькі пракосаў сухога сена было не зграбена. Даводзілася спяшацца, слізкая ручка грабляў ужо адчувальна націрала мазалі, пот заліваў вочы. Апошні ахапак быў кінуты на верх вялізнай капы акурат тады, калі першыя буйныя кроплі вады ўпалі з хмары на пыльную зямлю. З палёгкай уздыхнулася: паспела. І толькі калі перавяла дух, ужо назіраючы праз акно хаты, як напльваюць адна на адну хвалі дажджу, з горкай прыкрасцю сама сябе спытала: «А навошта?..»

Зграбенае сухое сена, нікому не патрэбнае, ляжала ў трох нязграбных вялікіх копах. Духмянае, зялёнае, смачнае для скаціны: там і канюшына, і цімафееўка, і шмат іншай добрай травы. Яно цяпер будзе мокнуць, сохнуць, зноў мокнуць, асядаць пад туманамі, ператворыцца ўрэшце ў рудую прыплясканую кучу. Паглядзела на суседнія надзелы — і там гэткія самыя наспех зграбеныя копы, якія ніхто не растрасе, каб падсушыць пасля дажджу, каб пасля звезці на вышкі. Дачнае сена — адна з прыкмет паміраючай вёскі, якая зімой упадае ў паўсонны стан разам са сваімі нешматлікімі жыхарамі, што застаюцца, а ўлетку ажывае пад нясціханы гул бензінавых ды электрычных трымераў, які стаў гэткай самай прыкметай лета на вёсцы, як салаўіны спеў ды бусліны клёкат. (Колас бы, напэўна, цяпер напісаў: «Ідуць касцы, гудуць іх косы...»)

ШТО з таго, што ў вёсцы засталася адна карова? Трава на вялікіх падворках, на прысядзібных участках, якая яшчэ гадоў дваццацьтрыццаць таму сеялася тагачаснымі гаспадарамі спецыяльна «пад сена», нікуды не дзелася і пасля першых вясновых дажджоў пачынае расці, квітнець, каласіцца. Калі не будзеш з гэтым нічога рабіць — рызыкуеш атрымаць штраф за непарадак на ўчастку. Даводзіцца касіць, пасля сушыць, пасля зграбаць. Хаця, у прынцыпе, можна і інакш: напрыклад, проста зграбці ў вялікую кучу пасярэдзіне, дачакацца бязветранага надвор'я і падпаліць. Або так і пакінуць ляжаць у пракосах. Але большасць чамусьці робіць па спрадвечным вясковым алгарытме. Да яго з ахвотай падключаешся, выконваеш усе ўстаноўленыя спрадвечныя правілы — спяшаешся зграбці сухое сена да дажджу, акуратна кладзеш яго ў капу пластамі, як калісьці вучыла бабуля, каб не раскідалася, нават падграбаеш акуратна кожную травінку. А навошта?..

КАБ успомніць, як у ружовай смузе, якая ахутвае сонца, што садзіцца, плыве па вуліцы стомлены сыты статак. Каровы пахнуць сырадоем, а ў Зоркі, якую частуеш хлебам, пыса мокрая і халаднаватая. Каб пачуць рыпенне цяжкога бухматага воза, напоўненага духмяным сенам. Воз вялізны, пераціснуты жэрдкай і вяроўкамі, блiскучая спіна каня недзе далёка ўнізе, а ты ляжыш на гэтай высокай вышыні і на небе, якое зусім блізка плыве разам з табой, разглядаеш аблокі і прыдумваеш, на каго ці на што яны падобныя. На мастку воз хістае з боку ў бок, і бацька саскоквае з сена і ідзе побач, падпіраючы яго дужым плячом, каб не перакуліўся. Каб адчуць смак вады з лясной крыніцы ў Бортніках, дзе сушылі сена. Вада ў ёй такая сцюдзёная, што зводзіць сківіцы, а спускацца да крыніцы трэба па вузенькай сцежцы ў кустах ляшчыны. На іх ужо суквецці зялёных яшчэ арэхаў, якія лёгенька і казытліва стукаюць па твары. Каб прыгадаць самы шчаслівы момант не толькі дзяцінства — падобнае ашаламляльнае шчасце за ўсё жыццё адчуваеш усяго некалькі разоў. На лясной дарозе брат раптам аддае табе ў рукі лейцы і саскоквае з вялізнага воза сена. Ты сядзіш, учапіўшыся ў гэтыя лейцы абедзвюма рукамі, баючыся нават паварушыцца, бо воз то падскоквае, то завальваецца на бок. А брат выбягае з лесу і шпурляе ўверх, на воз, крамяныя баравікі. Зноў знікае ў лесе і зноў кідае прыгаршчы грыбоў...

Каб упэўнена адчуць сябе дзіцем гэтай зямлі, знітаваць у адзін уласны лёс свае вясковыя ўспаміны і свае гарадское сёння, спалучыць і зразумець, што адно ад другога нікуды не падзенеш і не схаваеш. І стомлена прысесці на ганку роднай хаты, і адчуць заспакаенне, аб якім увесь час няспраўджана марыш у шалёным горадзе, бегучы па крузе і ніяк не могучы спыніцца...

...МОКНЕ пад цёплым дажджом у нязграбных копах нікому не патрэбнае дачнае сена.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.** *alena@zviazda.by*

■ Будзь у курсе!

## ДАДАТКОВЫЯ САСТАВЫ ДА АЛЕКСАНДРЫІ

**Беларуская чыгунка прызначыла на 8—9 ліпеня дадатковыя цягнікі да вёскі Александрыя Шклоўскага раёна.**

У гэтыя дні тут адбудзецца свята «Купалле» («Александрыя збірае сяброў»). Для перавозкі ўдзельнікаў і гасцей мерапрыемства магістраль і прызначае дадатковыя цягнікі рэгіянальных ліній эканом-класа. Яны будуць курсіраваць па маршруце Магілёў — Шклоў — Копысь (вёска Александрыя) — Шклоў — Магілёў і Орша — Копысь — Орша. З больш падрабязным раскладам руху дадатковых цягнікоў можна азнаёміцца ў касах і на сайце Беларускай чыгункі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*




*Любую матулю і бабулю*
***Алу Уладзіміраўну СІГАЙ***
*з Петрыкава сардэчна віншуем з 70-годдзем. Жадаем табе, родная, моцнага здароўя, доўгіх гадоў жыцця, і хай кожны дзень твой будзе шчаслівым!*

**З удзячнасцю тваё дочкі Святлана, Алена, Наталля, зяць Ігар і ўнукі.**


Даты | Падзеі | Людзі

**23 ЧЭРВЕНЯ**

**1803** год — Робер Фултан прадэманстраваў на рацэ Сене першае паравое судна.

**1860** год — створана Сакрэтная служба ЗША. Першапачатковай задачай супрацоўнікаў службы была барацьба з падробкай долараў. Пасля забойства ў 1901 годзе прэзідэнта ЗША Уільяма Мак-Кінлі ў абавязкі Сакрэтнай службы ўвайшла ахова прэзідэнта краіны.

**1888** год — у Кіеве адкрыты помнік Багдану Хмяльніцкаму.

**1912** год — нарадзіўся Алан Цюрынг, брытанскі матэматык і логік, работы якога паслужылі асновай для стварэння сучасных ЭВМ.



**1917** год — выйшаў першы нумар «Сялянскай газеты» — органа выканкама Савета сялянскіх дэпутатаў Мінскай і Віленскай губерняў. Газета публікавала справаздачы і рэзалюцыі губернскіх і павятовых з'ездаў сялянскіх дэпутатаў, пастановы сялянскіх сходаў, лісты чытачоў. Асвятлялася палітычнае становішча ў краіне, мясцовыя падзеі. Газета імкнулася растлумачыць сутнасць аграрнай палітыкі ў вёсцы, заклікала ствараць зямельныя камітэты. Выйшла 39 нумароў.

**1927** год — на Хадынскім аэрадроме падчас выпрабавальнага палёту Міхаіл Громаў першым з савецкіх лётчыкаў выкарыстаў выратавальны парашут.

**1947** год — нарадзіўся Георгій Лосік, беларускі вучоны ў галіне інжынернай тэхнікі, біякібернетыкі, доктар псіхалагічных навук. Аўтар навуковых работ на стыку псіхалогіі і кібернетыкі, па тэорыі распазнавання аб'ектаў з варыятыўнай формай, па стварэнні і выкарыстанні камп'ютараў для сляпых.

**1972** год — нарадзіўся Зінедзін Зідан, французскі футбаліст, паўабаронца зборнай Францыі і іспанскага «Рэала». Лепшы гулец свету (1998, 2000, 2003, 2006). У 1998 годзе выйграў «Залаты Мяч» як лепшы футбаліст Еўропы. У 2004 годзе ён быў прызнаны УЕФА найлепшым футбалістам апошніх 50-ці гадоў.



Было сказана

**Янка БРЫЛЬ, пісьменнік:**
*«Ты пачынаешся тады, калі ты робіш выбар сам».*

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Заход | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 4.38 | 21.46 | 17.08 |
| Віцебск — | 4.19 | 21.44 | 17.25 |
| Магілёў — | 4.28 | 21.36 | 17.08 |
| Гомель — | 4.34 | 21.23 | 16.49 |
| Гродна — | 4.55 | 21.59 | 17.04 |
| Брэст — | 5.05 | 21.50 | 16.45 |

## Месяц

***Маладзік 24 чэрвеня. Месяц у сузор'і Шаляў.***

## Імяніны

**Пр.** *Антаніны, Аляксандра, Васіля, Івана, Мікалая, Паўла, Феафана, Цімафея.*
**К.** *НАЙСВЯЦЕЙШАЕ СЭРЦА ІСУСА, Агрыпіны, Ванды, Альбіна, Базыля, Зянона, Пятра, Юзафа.*



Фота Максіма ШАСТАКОВА.

# ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

**Каратка аб сучаснай модзе:**
**1. Падраныя джынсы на нагах.**
**2. Трэснутыя экраны на смартфонах.**

Двое сяброў.
— Прывітанне, у мяне жонка на 18-м тыдні.
— Ты каго больш хочаш, хлопчыка ці дзяўчынку?
— Хлопчыка.
— А чаму?
— Верталёт хачу на радыёкіраванні.

**Лепш горкая праўда па 0,5, чым паўсалодкая хлусня па 0,7.**

Жадаючы скончыць загчнутую спрэчку, муж кажа жонцы:
— Дарагая, давай не будзем сварыцца, а абмяркуем усё спакойна...
— Не! Кожны раз, калі мы нешта спакойна абмяркоўваем, ты маеш рацыю!




Малюнак Алега ПАПОВА.


ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 2311.

Нумар падпісаны ў 19.30 22 чэрвеня 2017 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12